Урачы абяцалі яму пяць-сем гадоў жыцця…

СТАР. 3

Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

20 КАНАЛАЎ

Амаль дэтэктыўная гісторыя

СТАР. 7

Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

ЗВЯЗДА

3 МАЯ 2014 г. СУБОТА № 81 (27691) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«НА БЕЛАРУСКАЙ ЗЯМЛІ ЗАЎСЁДЫ БУДУЦЬ ПОМНІЦЬ ТЫХ, ХТО АДСТАЯЎ НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ І СВАБОДУ РАДЗІМЫ»

Штодзённая карпатлівая работа людзей робіць краіну больш багатай, бяспечнай і моцнай, адзначыў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка на цырымоніі ўручэння дзяржаўных узнагарод.

Фота БЕЛТА.

Ордэнам Айчыны III ступені ўзнагароджаны загадчык нейрахірургічнага аддзела РНПЦ неўралогіі і нейрахірургіі Міністэрства аховы здароўя Арнольд СМЕЯНОВІЧ.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што гэта ўрачыстае мерапрыемства прымеркавана да двух дзяржаўных свят — Дня працы і Дня Перамогі, якія ў Беларусі вельмі любяць.

Сярод узнагароджаных былі кіраўнікі перадавых прадпрыемстваў аграпрамысловага комплексу — адкрытых акцыянерных таварыстваў «Агра-Моталь» і «Гродзенскі мясакамбінат». Прэзідэнт падзякаваў у іх асобе работнікам сельскагаспадарчага сектара за адданасць роднай зямлі і нялёгкай сялянскай працы, якая спакон веку шанавалася нашымі продкамі.

Адзначаючы заслугі Беларускай асацыяцыі міжнародных аўтамабільных перавозчыкаў, кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: «Наша краіна імкнецца заняць дастойнае месца на міжнародным рынку транспартных паслуг». «Сапраўды, у гэтым ёсць вялікі сэнс: нашы аўтаперавозчыкі па-за канкурэнцыяй на постсавецкай прасторы і не толькі, у Еўропе ў цэлым», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле слоў Прэзідэнта, тэма патрыятызму напярэдадні святкавання Дня Перамогі набывае асаблівае гучанне. На беларускай зямлі заўсёды будуць помніць тых, хто прайшоў цярністымі дарогамі вайны, адстаяў незалежнасць і свабоду нашай Радзімы. Прэзідэнт падкрэсліў, што з асаблівай павагай мы адносімся да ветэранаў усіх войнаў. На яго думку, для маладога пакалення вельмі важны вопыт салдат, якія ведаюць сапраўдную цану згоды і міру.

Сярод узнагароджаных былі прадстаўнікі абласных арганізацый Беларускага саюза ветэранаў вайны ў Афганістане і Асацыяцыі інвалідаў вайны ў Афганістане. «На працягу многіх гадоў вы аказваеце дзейсную дапамогу ўдзельнікам, інвалідам баявых дзеянняў, праяўляеце клопат аб сем'ях ваеннаслужачых, якія загінулі пры выкананні воінскага абавязку ў Афганістане, уносіце прыкметны ўклад у падрыхтоўку маладых людзей да армейскай службы», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Высокіх узнагарод за бездакорную службу і прафесіяналізм удастоена вялікая група ваеннаслужачых. Прэзідэнт падзякаваў ім за вернасць абавязку і захаванне добрых традыцый, завешчаных нам пакаленнем пераможцаў.

Дзяржаўнымі ўзнагародамі адзначаны таксама поспехі беларускіх урачоў. «Прыемна адзначыць, што вы не толькі асвойваеце перадавы замежны вопыт, але і прапануеце ўласныя вынаходствы, распрацоўваеце айчынныя метады прафілактыкі і лячэння захворванняў», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Узнагароджваючы педагогаў і работнікаў культуры, кіраўнік дзяржавы сказаў, што на іх ускладаюцца вялікія надзеі. «У вашых сілах прымножыць тое добрае, што закладзена ў кожным чалавеку, стварыць атмасферу ўзаемапавагі і згоды ў грамадстве. А ў наш няпросты час усяму свету так не хапае дабра, духоўнасці і, самае галоўнае, разумення», — лічыць беларускі лідар.

На думку Прэзідэнта, асаблівую цеплыню і сардэчнасць прыўнеслі ў сённяшнюю сустрэчу жанчыны, удастоеныя ордэна Маці. Кожная з іх паспяхова спалучае прафесійную дзейнасць і выхаванне дзяцей.

На заканчэнне Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: «Спакон веку лічыцца, што добрасумленная праца на роднай зямлі робіць чалавека па-сапраўднаму шчаслівым. Кожны з вас на ўласным прыкладзе пацвердзіў, што гэта старадаўняя ісціна ўсё такая ж правільная і актуальная ў наш час. Дзякуй вам за тое, што дапамагаеце зберагчы і прымножыць галоўныя каштоўнасці для любога з нас — здароўе, бяспеку, спакой і дабрабыт».

Паводле БЕЛТА.

ДА СТАРТУ ГАТОВЫ!

Прэм'ер-міністр Міхаіл Мясніковіч праінспектаваў «Чыжоўка-Арэну».



Фан-зона на Дзяржынскага.

Фота БЕЛТА.

Шэсць дзён застаецца да адкрыцця чэмпіянату свету па хакеі ў Мінску: урачыстая цырымонія адбудзецца 9 мая на «Мінск-Арэне» і зойме 15-17 хвілін. Лядовыя пляцоўкі гатовы прыняць старт, а фан-зоны — балельшчыкаў. Першая фан-зона ўжо працуе на праспекце Дзяржынскага, а на «Чыжоўка-Арэне» адпрацоўваюцца некаторыя тэхнічныя моманты.

ЛІЧБА ДНЯ

546 жыхароў

Беларусі пераадолелі стагадовы рубеж. Прычым на 1 красавіка налічвалася 8 беларусаў ва ўзросце 110 гадоў і старэйшых. З іх трое жывуць у Гродзенскай вобласці, двое — у Мінскай, па адным — у Брэсцкай, Віцебскай і Магілёўскай абласцях. Па словах спецыялістаў, сярод айчынных доўгажыхароў лідзіруюць жанчыны з 7-разовай перавагай: 100-гадовую планку перасягнулі 478 жанчын і 68 мужчын. Нязменным флагманам па колькасці доўгажыхароў з'яўляецца Гродзенская вобласць: тут на 1 красавіка гэтага года пражывала 135 чалавек ва ўзросце больш за 100 гадоў.

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+7°
Віцебск	+10°
Гомель	+13°
Гродна	+10°
Магілёў	+11°
Мінск	+10°

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 3.05.2014 г.

Долар ЗША	9980,00	▲
Еўра	13820,00	▲
Рас. руб.	279,00	▲
Укр. грыўня	860,34	▲

НЕ ЗАБЫЦЬ НІВОДНАГА ВЕТЭРАНА

Краіна рыхтуецца да 70-годдзя свайго вызвалення

Яшчэ 20 мая 2013 года Указам Прэзідэнта Беларусі № 230 быў зацверджаны план падрыхтоўкі і правядзення мерапрыемстваў па святкаванні 70-й гадавіны вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Шэраг пунктаў гэтага плана накіраваны на аказанне сацыяльнай падтрымкі ветэранам, а таксама асобам, якія пацярпелі ад наступстваў вайны, і іх ушанаванне.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У адпаведнасці з Указам прадугледжваецца аказанне аднаразовай матэрыяльнай дапамогі ветэранам Вялікай Айчыннай вайны. На гэтыя мэты будзе расходавана 262,3 млрд рублёў. Выплата аднаразовай матэрыяльнай дапамогі будзе праводзіцца па месцы атрымання пенсіі ў перыяд з 1 чэрвеня па 1 ліпеня 2014 года.

Ужо да 1 мая былі завершаны комплексныя медыцынскія агляды інвалідаў і ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. Акрамя таго, традыцыйна ва ўсіх населеных пунктах краіны, уключаючы аддаленыя і маланаселеныя, штогод праводзіцца абследаванне матэрыяльна-бытавога становішча ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны і асоб, якія пацярпелі ад наступстваў вайны, з тым, каб выявіць праблемы. Па выніках абследавання ім аказваецца дапамога ў рамонце кватэр, дамоў, надворных пабудоў, печаў, электраправодак, сантэхнічнага, газавага, электратэхнічнага абсталявання, установаў пажарных апавяшчальнікаў. Плануецца, што ўсе заяўкі ветэранаў будуць задаволены да 1 ліпеня гэтага года.

Акрамя таго, у перыяд з 1 па 5 ліпеня 2014 г. інвалідам і ўдзельнікам Вялікай Айчыннай вайны будзе дадзена права бясплатнага карыстання паслугамі стацыянарнай тэлефоннай сувязі.

Ветэраны Вялікай Айчыннай вайны з 1 па 31 мая таксама змогуць па ўсёй краіне бясплатна прайсці дзяржтэхагляд на падведамных Мінтрансу дыягнастычных станцыях.

Святлана БУСЬКО.

■ Надвор'е

ХВАЛЯ ХОЛАДУ

У ноч на аўторак месцамі магчымы мокры снег

У суботу на тэрыторыю нашай краіны працягне паступаць даволі свежае паветра з поўначы Еўропы, якое прынясе чарговую порцыю холаду, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга Фядотава.

Сёння будзе пераважна без ападкаў, толькі па паўднёвым захадзе прагназуецца кароткачасовы дождж, месцамі навальніца. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе плюс 9-15 градусаў. У нядзелю ў краіну завітаюць сур'ёзныя атмасферныя франты, таму па паўднёвым усходзе чакаюцца дажджы, у асобных раёнах моцныя дажджы і нават навальніцы. Тэмпература паветра ўначы на нядзелю складзе плюс 1-6 цяпла, а па паўночным захадзе прагназуюцца замаразкі да 0 — мінус 3 градусаў. Удзень будзе 6-13 цяпла, а месцамі — да плюс 14-17 градусаў.

На фоне паніжанага атмасфернага ціску кароткачасовыя дажджы прагназуюцца і ў панядзелак. Тады на поўначы краіны ўзмоцніцца вецер парывамі да 15-20 м/с. Тэмпература паветра ўначы на панядзелак будзе 1-6 цяпла, месцамі знізіцца да 0 — мінус 3, удзень — плюс 7-14 градусаў. Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, халоднае надвор'е захаваецца ў аўторак і сераду. Больш за тое, уначы на аўторак месцамі магчымы нават мокры снег. Тэмпература паветра ўначы на аўторак 1-6 цяпла, часам замаразкі да мінус 3, удзень — 7-14 цяпла. У сераду дажджы чакаюцца толькі месцамі, а вось замаразкі ўначы да мінус 4 градусаў прагназуюцца ўжо амаль паўсюдна. Удзень у сераду крыху пацяплее: чакаецца ўжо плюс 12-17 градусаў, а на поўдні — да 18-20 цяпла.

Сяргей КУРКАЧ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ДВА ЧАЛАВЕКІ ПАЦЯРПЕЛІ ПРЫ АБРУШВАННІ КАНСТРУКЦЫЙ ДАХУ ГАНДЛЁВАГА ЦЭНТРА Ў ВІЛЬНЮСЕ

Дзве дзяўчыны атрымалі траўмы пры абвальванні часткі канструкцый даху ў гандлёвым цэнтры «Акропаліс» у Вільнюсе, паведамляюць інфармагенцтвы.

Траўмы пацярпелых пры абрушэнні не ўяўляюць небяспекі для жыцця. Сярод магчымых прычын інцыдэнту называюцца моцны вецер і перапад тэмператур. «Акропаліс» належыць літоўскай сістэме Maxima, у рыжскім гандлёвым цэнтры якой у лістападзе 2013 загінулі больш за 50 чалавек з-за абрушэння даху.

ПРАМЫСЛОВАЕ ЛОБІ ГЕРМАНІІ СУПРАЦЬ САНКЦЫЙ У ДАЧЫНЕННІ ДА РАСІІ

Найбуйнейшыя кампаніі Германіі, у тым ліку BASF SE, Siemens AG, Volkswagen AG, Adidas AG і Deutsche Bank AG, выступілі супраць пашырэння эканамічных санкцый у дачыненні да Расіі як у прыватных гутарках, так і ў публічных заявах, піша The Wall Street Journal. З пагаршэннем сітуацыі ва Украіне на высокапастаўленых чыноўнікаў абрынуўся шквал званкоў ад кіраўніцтва карпарацый з патрабаваннем не здзяйсняць ніякіх крокаў, якія паставяць пад пагрозу іх дзелавыя інтарэсы ў Расіі, сцвярджае выданне са спасылкай на неназваную крыніцу.

БОЛЬШ ЗА 170 ЧАЛАВЕК ПАЦЯРПЕЛІ ПРЫ СУТЫКНЕННІ ЦЯГНІКОЎ У МЕТРО

Больш за 170 чалавек пацярпелі ў выніку сутыкнення цягнікоў у метро Сеула, перадаюць інфармагенцтвы. Два цягнікі сутыкнуліся недалёка ад станцыі, у выніку чаго адзін з іх сышоў з рэек. Паводле слоў прадстаўніка службы выратавання, многія пасажыры атрымалі траўмы, калі сасковалі з цягнікоў на рэйкі. Пацярпелыя дастаўлены ў бальніцу.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

ВА УКРАІНЕ АДНОЎЛЕНЫ ПРЫЗЫЎ У ВОЙСКА

Прызначаны Вярхоўнай Радай выканаўцам абавязкаў прэзідэнта Украіны спікер парламента Аляксандр Турчынаў падпісаў указ «Аб мерах па павышэнні абараназдольнасці дзяржавы». Дакумент прадугледжвае аднаўленне прызыву ва Узброеныя Сілы, паведамляюць інфармацыйныя агенцтвы. Неабходнасць прыняцця ўказа тлумачыцца абвастрэннем сітуацыі на паўднёвым усходзе краіны, фактамі непрыхаваных агрэсіі, захопам і блакаваннем будынкаў органаў дзяржаўнай улады, ваеннага кіравання, воінскіх часцей, транспартных камунікацый у Данецкай і Луганскай абласцях і г.д. Пад дзеянне дакумента падпадаюць маладыя людзі ва ўзросце ад 18 да 25 гадоў, якія не маюць права на вызваленне або адтэрміноўку ад прызыву на тэрміновую ваенную службу. Апошні прызыў ва ўкраінскае войска прайшоў у кастрычніку 2013 года, і з 2014 года планавалася прызыў спыніць. Меркавалася, што войска да канца бягучага года павінна цалкам перайсці да камплектавання вайскоўцамі па кантракце.

КАРОТКА

Адпраўка новага папаўнення ва Узброеныя Сілы Беларусі, а таксама іншыя воінскія фарміраванні будзе праходзіць з 15 па 30 мая.

У першым квартале бягучага года найбольш крымінагеннымі саставамі з міжнародных цягнікоў былі Днепрапятроўск — Санкт-Пецярбург і Брэст — Масква, паведамілі ў МУС Беларусі. На маршруце Днепрапятроўск—Санкт-Пецярбург за гэты час было зафіксавана 3 факты кантрабанды і 2 — незаконнага абарачэння наркатычных сродкаў, а ў цягніках Брэст — Масква — 4 крадзяжы.

Стартуе продаж квіткоў на канцэрты адкрыцця і закрыцця «Славянскага базару». З 1 4 мая прыярытэтнае права на рэалізацыю білетаў будзе ў Віцебска, а з 5 мая яны стануць даступныя ў сістэмах білетных аператараў kvitki.by і ticketpro.by, у касах усіх абласных і раённых цэнтраў Беларусі.

Найбольш высокааплатнымі ў сталіцы ў сакавіку былі работнікі арганізацый, звязаных з вылічальнай тэхнікай і фінансавай дзейнасцю. Сярэдняя заработная плата работнікаў у гэтых арганізацыях склала адпаведна Br15991 тыс. і Br14663 тыс.

■ Рэальная небяспека

РАСЛІНЫ-АГРЭСАРЫ ІДУЦЬ У НАСТУП

Інвазіўныя віды з Паўночнай Амерыкі захопліваюць нашы абсягі

Баршчэўнік Сасноўскага, сумнік канадскі, «шалёны агурок», рабінія псеўдаакацыя, ясенялісты клён... Апроч баршчэўніка, пра астатнія віды раслін гучна загаварылі летась, калі выявілася, што маштабы іх распаўсюджвання на тэрыторыі Беларусі нагадваюць сапраўдную экспансію.

Прычыны з'яўлення гэтых відаў на тэрыторыі Беларусі розныя. Баршчэўнік меркавалася выкарыстоўваць у якасці корму для жывёлы. Ясенялісты клён і рабінія псеўдаакацыя шырока выкарыстоўваліся падчас азелянення. А сумнік канадскі і эхінацыстыс лопасцевы (вядомы ў народзе пад назвай «шалёны агурок») ужываліся ў якасці дэкаратыўных раслін.

Зразумела, што з такімі агрэсіўнымі чужынцамі трэба змагацца. Так, у Мінску за апошнія два гады плошча, занятая баршчэўнікам Сасноўскага, скарацілася ажно ў чатыры разы! Ды вось толькі экспансійную эстафету ў яго перахапілі сумнік канадскі ды «шалёны агурок», якія пакуль перамагаюць чалавека...

СТАР. 2



«Шалёны агурок» стварае непралазныя зараснікі.

КАДРАВЫЯ РАШЭННІ ПРЭЗІДЭНТА

Кіраўнік дзяржавы назначыў:

Барысевіча Мікалая Мікалаевіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Каралеўстве Нідэрландаў, пастаянным прадстаўніком Рэспублікі Беларусь у Арганізацыі па забароне хімічнай зброі па сумяшчальніцтве; Чапурнога Станіслава Уладзіміравіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Манголіі; Палуяна Ігара Іванавіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Эквадор; Чыжыка Сяргея Антонавіча — першым намеснікам старшыні Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі; Кіліна Сяргея Якаўлевіча — намеснікам старшыні Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі; Кільчэўскага Аляксандра Уладзіміравіча — галоўным вучоным сакратаром Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі; Рачкова Сяргея Анатольевіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Судан па сумяшчальніцтве; Козінцава Віктара Васільевіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Чылі, Рэспубліцы Перу і Усходняй Рэспубліцы Уругвай па сумяшчальніцтве.

Прэзідэнт таксама даў згоду на назначэнне:

Грабнёва Генадзя Іванавіча — першым намеснікам старшыні Віцебскага аблвыканкама; Неўмяржыцкага Сяргея Пятровіча — намеснікам старшыні Мінскага аблвыканкама; Чыкіды Алега Іванавіча — намеснікам старшыні Магілёўскага аблвыканкама — старшынёй камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні; Драздоўскага Сяргея Аляксандравіча — старшынёй Чавускага райвыканкама; Жука Аляксандра Іванавіча — рэктарам установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»; Сендзер Ганны Мікалаеўны — рэктарам установы адукацыі «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С.Пушкіна»; Шыла Вячаслава Дзмітрыевіча — намеснікам міністра аховы здароўя; Хільмана Сяргея Анатольевіча — намеснікам міністра інфармацыі; Дрыга Ірыны Уладзіміраўны — першым намеснікам міністра культуры; Малкінай Ілі Вітальеўны — першым намеснікам міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя; Буянава Алега Аляксеевіча — генеральным дырэктарам адкрытага акцыянернага таварыства «Клімавіцкі лікёра-гарэлачны завод»; Карпяка Уладзіміра Валянцінавіча — генеральным дырэктарам адкрытага акцыянернага таварыства «Мінскі завод шасцерань»; Іодзіса Станіслава Антонавіча — генеральным дырэктарам адкрытага акцыянернага таварыства «МІНСК КРЫШТАЛЬ»; Гунько Сяргея Марцінавіча — генеральным дырэктарам адкрытага акцыянернага таварыства «Віцязь»; Гулевіч Алены Фёдараўны — начальнікам дэпартамента эканомікі і галіновых праграм Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы.

■ Прыёмная кампанія—2014

У АБІТУРЫЕНТАЎ БУДЗЕ ДРУГІ ШАНЦ...

...але замест двух патокаў застанецца адзін

2 мая ў краіне распачалася рэгістрацыя абітурыентаў на цэнтралізаванае тэсціраванне, якая будзе доўжыцца да 1 чэрвеня ўключна. Такім чынам, для таго, каб запасціся пропускамі на ЦТ, абітурыентам даецца амаль цэлы месяц, на працягу якога яны могуць завітаць у любы бліжэйшы да іх месца жыхарства пункт рэгістрацыі. Усе пункты падключаны да аўтаматызаванай сістэмы «Агульнарэспубліканскі банк звестак удзельнікаў ЦТ». Сістэма працуе па прынцыпе «аднаго акна»: сама шукае свабодныя пасадачныя месцы і падказвае рэгістратару, у якіх навучальных установах можна здаць тыя ці іншыя прадметы. Яна дазваляе падабраць абітурыенту найбольш зручнае для экзамену месца, нават калі той пажадае здаваць цэнтралізаванае тэсціраванне ў іншым горадзе.

Хто не паспеў — той спазніўся

— Аднак, як сведчыць вопыт папярэдніх гадоў, некаторым маладым людзям нават цэлага месяца, які адводзіцца для рэгістрацыі, усё роўна не хапае, а на наступны дзень пасля закрыцця пунктаў рэгістрацыі яны пачынаюць шукаць варыянты, просяць увайсці ў іх становішча і ў парадку выключэння даць ім магчымасць зарэгістравацца. Хачу папярэдзіць усіх «няпамятлівых»: тыя, хто спозніцца, няхай крыўдуюць самі на сябе і чакаюць наступнай прыёмнай кампаніі, — падкрэслівае **міністр адукацыі Сяргей МАСКЕВІЧ.**

У адрозненне ад папярэдняга года колькасць пунктаў правядзення цэнтралізаванага тэсціравання скарацілася з 73 да 58, што звязана са змяншэннем агульнай колькасці абітурыентаў. Сказаць, колькі ж знойдзецца сёлета ахвотных штурмаваць ВНУ, у Міністэрстве адукацыі не бяруцца. Дакладна вядома толькі, што колькасць выпускнікоў агульнаадукацыйных школ зменшылася на 6 працэнтаў: з 11-х класаў выпускаюцца 55 тысяч чалавек. Але ж традыцыйна ў прыёмнай кампаніі ўдзельнічаюць і выпускнікі папярэдніх гадоў, а таксама выпускнікі прафесійна-тэхнічных і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў...

Усяго сёлета ва ўстановы вышэйшай адукацыі плануецца прыняць на бюджэтную форму навучання 29,1 тысячы чалавек: 22,9 тысячы чалавек на дзённую і 6,2 тысячы чалавек — на завочную. Прыём на «бюджэт» скарочаны на 1 800 месцаў, пераважна за кошт змяншэння набору на спецыяльнасці эканамічнага і юрыдычнага профіляў.

Зніжэнне парогу

Як зазначыў Сяргей Маскевіч, галоўнай адметнасцю сёлетняй прыёмнай кампаніі стане знікненне двух патокаў пры паступленні і магчымасць правядзення дадатковага набору на вакантныя месцы. Прыём дакументаў на бюджэтныя месцы на ўсе формы навучання будзе праводзіцца ў дзяржаўных ВНУ ў вельмі сціслыя тэрміны — з 8 па 12 чэрвеня. Уступныя іспыты ў ВНУ сілавых ведамстваў пройдуць з 13 па 16 ліпеня, у творчых ВНУ — з 13 па 22 ліпеня, а ва ўсіх астатніх — з 13 па 18 ліпеня.

Залічэнне абітурыентаў на бюджэтныя месцы ў вышэйшыя навучальныя ўстановы МУС і МНС, а таксама ў Інстытут пагранслужбы і Ваенную акадэмію пройдзе па 20 ліпеня; у Акадэміі мастацтваў, Акадэміі музыкі і Універсітэце культуры — па 26 ліпеня. У іншых ВНУ — па 22 ліпеня.

У тым выпадку, калі ў якой-небудзь ВНУ застануцца незапоўненыя бюджэтныя месцы, будзе аб'яўлены дадатковы набор. І вось тут ёсць адзін важны нюанс. На вакантныя месцы змогуць прэтэндаваць абітурыенты, якія не прайшлі па конкурсе пры паступленні ў іншыя ВНУ, але маюць на руках патрэбныя сертыфікаты, або паступалі на іншыя спецыяльнасці ў тую ж ВНУ. Таксама да конкурсу на вакантныя месцы будуць дапушчаны і абітурыенты, якія не набралі на цэнтралізаваным тэсціраванні ўстаноўленую мінімальную колькасць балаў.

Для тых, хто будзе паступаць на бюджэтныя месцы ў рамках дадатковага набору, парог будзе зніжаны на пяць балаў: у сертыфікатах па рускай і беларускай мовах абітурыенты павінны будуць мець не менш як 5 балаў, па матэматыцы, фізіцы, хіміі і біялогіі — 10 балаў ; 15 балаў — па гісторыі Беларусі, сусветнай гісторыі найноўшага часу, грамадазнаўстве, геаграфіі і замежных мовах.

Прыём дакументаў на вакантныя месцы ў ВНУ сілавых ведамстваў будзе весціся з 21 па 25 ліпеня, у «творчых» ВНУ — з 27 па 28 ліпеня, ва ўсіх астатніх — з 23 па 28 ліпеня. Пасля правядзення другой «хвалі» залічэння на вакантныя бюджэтныя месцы абітурыенты змогуць падаваць дакументы на платную форму навучання (да 31 ліпеня). А 2 жніўня стануць вядомыя спісы залічаных на навучанне за ўласныя сродкі.

У ССНУ — па сярэднім бале школьнага атэстата

Яшчэ адна акалічнасць, на якую міністр адукацыі папрасіў звярнуць увагу: гэтым летам выпускнікі базавай школы будуць паступаць у сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы ўвогуле без экзаменаў (за выключэннем спецыяльнасцяў, дзе прадугледжаны «творчы экзамен»): конкурс будзе ажыццяўляцца па сярэднім бале пасведчання аб агульнай базавай адукацыі. Праўда, у галоўным адукацыйным ведамстве не выключаюць, што на асабліва прэстыжных у моладзі спецыяльнасцях можа скласціся напружаная сітуацыя, калі дакументы пададуць спрэс адны выдатнікі. І як у такім разе прыёмнай камісіі вызначыць з іх самых годных? «Значыць, давядзецца задзейнічаць дадатковыя крытэрыі. У правілах прыёму прапісана, хто мае пераважнае права на залічэнне пры аднолькавай суме балаў. Для прыёмнай камісіі гэта, вядома, будзе выпрабаваннем, але ніхто не перашкаджае ўстанове адукацыі ўвесці і свае дадатковыя крытэрыі, калі ў гэтым будзе патрэба», — удакладніў Сяргей Маскевіч.

Што тычыцца набору на мэтавыя месцы, то яго план пакуль яшчэ не сфарміраваны.

— Прызнаемся, нам хацелася б значна актывізаваць работу галіновых міністэрстваў і працадаўцаў і ў плане правядзення прафарыентацыйнай работы з абітурыентамі, і ў плане фарміравання заказу на падрыхтоўку кадраў і большай іх актыўнасці непасрэдна ў працэсе падрыхтоўкі кадраў, — падкрэсліў міністр адукацыі. — Да пачатку прыёмнай кампаніі кантрольныя лічбы прыёму на мэтавую форму навучання будуць Міністэрствам адукацыі зацверджаны. А далей плануем прааналізаваць яе вынікі. Асабіста я лічу вырашэнне кадравых пытанняў праз мэтавую падрыхтоўку спецыялістаў найбольш эфектыўным.

А ці будзе павялічаны тэрмін адпрацоўкі так званых «мэтавікаў»? Сёння для іх дзейнічае наступная формула: выпускнікі вышэйшых навучальных устаноў адпрацоўваюць пасля заканчэння навучання пяць гадоў — два гады па размеркаванні і тры гады па кантракце. А выпускнікі сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў абавязаны адпрацаваць на свайго заказчыка тры гады: два гады па размеркаванні і год — па кантракце. Відаць па ўсім, калі нейкія змены і адбудуцца, то на абітурыентаў гэтага года яны не распаўсюдзяцца...

Нагадаем, што, паводле новых правіл прыёму, мэтавую падрыхтоўку дазволена ажыццяўляць па любых спецыяльнасцях, а прэтэндаваць на мэтавы кантракт можа любы абітурыент, незалежна ад месца свайго пражывання, у тым ліку мінчане і жыхары абласных цэнтраў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

■ Погляд Аляксандра Шпакоўскага

ПЫТАННІ І АДКАЗЫ ЕЎРАЗІЙСКАЙ ІНТЭГРАЦЫІ

Пасяджэнне Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета на ўзроўні кіраўнікоў дзяржаў, што адбылося ў Мінску на гэтым тыдні, пакінула па выніках больш пытанняў, чым адказаў. Айчынныя і замежныя аналітыкі адзначаюць вельмі «няпросты характар» перамоў, што цалкам зразумела, асабліва з улікам таго, што еўразійскі праект выходзіць на фінішную прамую, і апошнія спробы ўнесці некаторыя карэкціроўкі ў агульныя планы ўдзельнікі інтэграцыі павінны зрабіць цягам бліжэйшых месяцаў. Менавіта пад такім вуглом, як ключавую рэпетыцыю перад вырашальнай прэм'ерай Еўразійскага эканамічнага саюза, і патрэбна разглядаць мінскую сустрэчу.

У якасці пазітыўных фактаў можна сцвярджаць, што бакі працягваюць курс на еўразійскую інтэграцыю, адпаведныя пагадненні паміж дзяржавамі мытнай тройкі мусяць быць падпісаны падчас наступнага саміту, што плануецца 29 мая ў сталіцы Казахстана Астане. Спецыялісты Еўразійскай эканамічнай камісіі прадставілі прэзідэнтам для разгляду праект саюзнага дагавора, што больш чым на 600 старонках змяшчае нормы Мытнага саюза, Адзінай эканамічнай прасторы, каля 70 міжнародных дагавораў, а таксама новыя прапановы, датычныя пашырэння агульнага рынку на раней незакранутыя сегменты, у тым ліку на энергетычны сектар і рынак паслуг. Моцным станоўчым вынікам таксама стала супольная згода адносна неабходнасці пашырэння інтэграцыі за кошт новых удзельнікаў. Першай еўразійскай ластаўкай Закаўказзя мусіць стаць Арменія, што выканала ўсе пункты адпаведнай «дарожнай карты» і плануе далучыцца да Мытнага саюза ўжо ў чэрвені 2014 года.

Праблемы еўразійскага будаўніцтва

Такія вынікі, безумоўна, сведчаць аб поспехах еўразійскай інтэграцыі, аднак іншыя факты не дазваляюць паддавацца «галавакружэнню ад поспехаў» і прымушаюць сур'ёзна задумацца аб мэтах і перспектывах еўразійскага праекта. Напрыклад, супольны энергетычны рынак, роўныя ўмовы гаспадарання і атрымання энергетычных рэсурсаў, згодна з праектам дагавора, мусяць быць сфарміраваны на працягу бліжэйшых дзесяці гадоў — ажно да 2025 года. На практыцы для Беларусі гэта азначае значныя страты бюджэту — каля 35-40 млрд доларaў ЗША, бо толькі сёння Мінск вымушаны пералічваць на карысць расійскага бюджэту каля 3,5-4 млрд штогод у якасці экспартнай пошліны пасля рэалізацыі нафтапрадуктаў, выраблены беларускімі прадпрыемствамі з расійскай нафты.

Нават калі не спыняцца на дзіўным прававым аспекце гэтай пошліны (Беларусь плаціць замежнай дзяржаве з прыбыткаў ад продажу ўласнай прадукцыі), а таксама не задавацца маральным бокам праблемы (беларусы, у ліку іншых народаў СССР, нямала працавалі падчас асваення нафтавых радовішчаў, якімі зараз паспяхова карыстаецца расійскі бізнес), то застаецца пытанне іншага характару: як без агульнага рынку энерганосьбітаў, што для эканомікі, нібы крывяносныя сасуды для чалавечага арганізма, будзе працаваць Еўразійскі эканамічны саюз? Відавочна, што любыя больш-менш сур'ёзныя сумесныя праекты, у тым ліку інфраструктурныя, на якіх засяродзіў увагу цягам сустрэчы Прэзідэнт Казахстана Назарбаеў, патрабуюць адзінства падыходаў энергетычнай палітыкі, роўнасці ўмоў гаспадарання, паўнафарматнага мытнага саюза без выключэнняў і абмежаванняў. У іншым выпадку, калі ў адных удзельнікаў з рэсурсамі «густа», а ў другіх «пуста», ні пра якую эфектыўнасць інтэграцыі нават не можа быць гаворкі. У такіх абставінах, адкрываючы для багатых рэсурсамі партнёраў уласныя рынкі, пазбаўляючыся магчымасцяў дзяржаўнага рэгулявання і пратэкцыі, Беларусь практычна нічога не атрымлівае ўзамен. Між іншым, для айчыннай эканомікі экспартнага тыпу асноўны сэнс інтэграцыі палягае менавіта ў забеспячэнні доступу беларускай індустрыі да сыравіннай базы партнёраў.

Дысбаланс інтарэсаў

Цікава, што ў расійскай прэсе, дыпламатычных і экспертных асяродках Еўразійскі Саюз разглядаецца не толькі як эканамічны, але, у першую чаргу, геапалітычны праект, так бы мовіць, «наш адказ Захаду». З гэтых пазіцый выглядае яшчэ больш дзіўным той момант, што цалкам слушныя заўвагі беларускага боку ўжо каторы год бюракратызуюцца, адкладаюцца і заблытваюцца на шляху інтэграцыі. Відаць, нават геапалітычныя амбіцыі вышэйшага расійскага кіраўніцтва не ў стане перамагчы камерцыйныя інтарэсы фінансавасыравінных алігархічных колаў.

Новыя імпульсы для Саюзнай дзяржавы

Менавіта гэты дысбаланс інтарэсаў і з'яўляецца асноўнай пагрозай еўразійскай інтэграцыі, як у яе эканамічным, так і ў геапалітычным выражэнні. Зразумела, што ў абставінах міжнароднага напружання Крэмль мусіць угаварыць партнёраў падпісаць хоць які саюзны дакумент, і гэта будзе сведчыць у вачах сусветнай супольнасці пра тое, што Расія не адна і мае саюзнікаў. Падобна на тое, што беларускае кіраўніцтва застанецца верным саюзнаму абавязку і можа пайсці насустрач расійскім партнёрам, аднак выглядае, што сама еўразійская інтэграцыя рызыкуе стаць перыферыйным знешнепалітычным праектам, прынамсі, для беларускага боку. Старшыня калегіі Еўразійскай эканамічнай камісіі Віктар Хрыстэнка сам прапанаваў «найбольш адчувальныя пытанні вырашаць у двухбаковым фармаце», а ў адносінах Беларусі і Расіі ёсць праект апераджальнай інтэграцыі — Саюзная дзяржава, і будзе лагічна, калі асноўныя высілкі айчыннай дыпламатыі будуць скіраваны менавіта на актывізацыю гэтага праекта.

Зразумела, што патрэбна працаваць на тых напрамках, дзе могуць быць дасягнуты канкрэтныя вынікі і рашэнні, а распыляцца на лішнюю актыўнасць беларуская дзяржава проста не мае рэсурсаў. Відавочна, што нават поруч з еўразійскай інтэграцый Беларусь можа прэтэндаваць на «асаблівыя адносіны» з Расійскай Федэрацыяй за кошт наяўнасці Саюзнай дзяржавы. Пры гэтым айчыннаму кіраўніцтву трэба ўлічваць пакуль непрадказальны характар буйнога расійскага капіталу, што сваімі не зусім чыстымі памкненнямі можа спыніць развіццё любога перспектыўнага праекта. Такая выснова на практыцы азначае, што Беларусі неабходна працягваць высілкі па максімальнай дыверсіфікацыі эканамічных кантактаў, а таксама працаваць у напрамку змяншэння энергетычнай залежнасці. Але такі падыход ні ў якім разе не адмаўляе ўдзелу ў інтэграцыйных працэсах на постсавецкай прасторы, бо не трэба забываць, што сама ідэя інтэграцыі ўпершыню прагучала ў Мінску і асноўным ініцыятарам гэтых працэсаў была менавіта Рэспубліка Беларусь.

РАСЛІНЫ-АГРЭСАРЫ ІДУЦЬ У НАСТУП

Сумныя наступствы сумніка

— У 2010 годзе мы правялі кадастравае даследаванне беларускай расліннасці, — гаворыць **загадчык сектара кадастру раслiннага свету Інстытута эксперыментальнай батанікі імя В.Ф. Купрэвіча НАН Беларусі Алег МАСЛОЎСКІ.** — Падчас яго выявілася, што на тэрыторыі краіны ўкаранілася шмат інвазіўных, чужародных для нашай флоры відаў. І «ганаровае» першае месца тут належыць сумніку канадскаму.

Гэтую расліну бачылі ў апошні час усе. Сцябліна яе вырастае на вышыню ад 50 да 200 сантыметраў. Лісце ў сумніка востравугольнае. Наверсе сцябліны знаходзяцца жоўтыя мяцёлкі.

Паўночнаамерыканскі прышэлец распаўсюдзіўся па тэрыторыі Еўразіі як прыгожая дэкаратыўная расліна. Паступова ён перасяліўся ў навакольнае асяроддзе і здзічэў. У Беларусі ён сустракаецца амаль паўсюдна.

— Сумнік прадуцыруе вялікую колькасць насення, — працягвае Алег Маслоўскі. Толькі адна мяцёлка можа даць да 20 тысяч сямянак! Больш за тое, з кожным годам сумнік становіцца ўсё больш агрэсіўным і нахабным. Вучоныя параўналі сучасныя даныя па гэтай расліне з інфармацыяй дзесяцігадовай даўніны. Аказалася, што цяпер карнявішчы расліны выдзяляюць у глебу значна больш атрутных рэчываў, чым тады. Гэта і ёсць дыверсійны механізм сумніка, які, бескантрольна распаўсюджваючыся, змяняе «пад сябе» структуру і рэзка пагаршае якасць і каштоўнасць сельскагаспадарчых угоддзяў. Тыя ж лугі становяцца малапрадукцыйнымі. А буйная рагатая жывёла сумнік не есць, бо ён вельмі атрутны. Тут жа трэба дадаць, што здзічэлы канадскі «госць» пачаў актыўна пранікаць у лясы, дзе знішчае натуральную расліннасць. На новай радзіме ён уплывае на суседнія расліны куды больш негатыўна, чым на гістарычнай. Але пры ўсім гэтым з сумніка можа здабыць і карысць. У ім знаходзіцца шэраг цікавых для вучоных рэчываў. Ужо сёння ён выкарыстоўваецца ў фармакалогіі для лячэння кардыялагічных захворванняў. Беларускія вучоныя распрацоўваюць прэпараты, якія будуць скіраваны на барацьбу з анкалогіяй...

Сумнік канадскі можа дасягаць у вышыню двух метраў.

Канадскі сумнік масава высаджвалі ледзь не ў кожнай вёсцы. Шмат яго расце і на могілках — людзей падкупіла яго прыгажосць і неператворлівасць да знешніх умоў. Але цяпер маштабы распаўсюджання гэтай расліны прынялі сапраўды пагражальныя для аграрнага сектара памеры. Таму навукоўцы звяртаюцца да ўсіх з заклікам: не саджайце сумнік, экінацыстыс лопасцевы ды іншыя інвазійныя віды, не псуйце сваю родную прыроду.

А калі вы дзесьці знайшлі зараснік гэтых раслін, то абавязкова паведамляйце аб гэтым у Інстытут эксперыментальнай батанікі па тэлефоне (017) 284 20 25. Бо калі мы не спынім агрэсію раслін-чужынцаў сёння, заўтра на гэта спатрэбіцца значна больш сродкаў і сіл. Так, у краінах Заходняй Еўропы і ЗША штогадовыя страты, якія прыносяць інвазійныя віды раслін, ужо вымяраюцца ў астранамічных лічбах у дзясяткі мільярдаў доларaў...

Канцэнтр арэала канадскага сумніка знаходзіцца там, дзе яго пачалі выкарыстоўваць раней за ўсё. Яго інтэнсіўна высаджвалі на могілках, прысядзібных участках, ля дамоў у вёсках... Паступова ён стаў утвараць тут буйныя папуляцыі і нават зараснікі.

Стратэгія «паводзін» сумніка зменлівая. Спачатку ён расце невялікімі групамі і развіваецца павольна. Аднак калі асобныя папуляцыі зліваюцца ў адзін вялікі масіў, тут сумнік і пачынае масіраваць наступ на вольныя ад яго тэрыторыі. І плошча, якую займае гэты від, кожны год павялічваецца на 15-20%. А гэта вельмі шмат.

Увосень сумнік з'яўляецца для месца, дзе ён расце, сапраўднай бомбай без дэтанатара. У гэтую пару старыя сцябліны пустазелля становяцца сухімі. Зараснікі яго вельмі лёгка ўспыхваюць ад выпадковай іскры...

Калі ж сумнік вырас побач з вашым прысядзібным участкам, яго неабходна як мага хутчэй выдаліць. Лепш за ўсё скошваць небяспечную расліну два разы на год. Гэта робіцца для таго, каб не даць сумніку зацвісці і ўтварыць насенне...

«Шалёны агурок» захоплівае берагі вадаёмаў

«Шалёны агурок» распаўсюджваецца хутчэй за сумнік з баршчэўнікам. Змагацца з гэтай ліянай вельмі цяжка — на сваім шляху яна аблытвае ўсё. Таму адзіны дзейсны, але няпросты варыянт — гэта знішчаць такія зараснікі падчыстую. А ўжыванне гербіцыдаў у барацьбе з «захопнікам» абмежавана тым, што расце ён пераважна ў поймах рэк...

— Гэтая ліяна на пару з сумнікам шырока выкарыстоўвалася для дэкаратыўнага аздаблення тэрыторыі, — гаворыць Алег Маслоўскі. — Цяпер жа яна таксама вырвалася з-пад кантролю. І ў перспектыве можа стаць навалай больш небяспечнай, чым сумнік, — у канкурэнцыі за месца пад сонцам з ім і баршчэўнікам «шалёны агурок» выходзіць пераможцам. Ачаг яго распаўсюджання — Палессе і пойма Дняпра. Летась пачалася імклівая экспансія эхінацыстыса на поўнач. Па цячэнні Нёмана ён ужо падабраўся да Гродна. На берагах Свіслачы гэты «агрэсар» ужо знаходзіцца на подступах да Мінска.

Нам трэба карэктаваць тактыку і пераходзіць ад абароны да рашучага наступу на гэтых дыверсантаў у раслінным абліччы. Яркі прыклад гэтага — сітуацыя з баршчэўнікам. Дзякуючы актыўнаму змаганню з гэтай навалай на тэрыторыі Мінска за апошнія два гады ўдалося паменшыць займаную ім плошчу ў чатыры разы. Але ў ідэале трэба распрацоўваць комплекс неабходных мерапрыемстваў да таго, як пачнецца экспансія чарговага небяспечнага інвазіўнага віду. Так, да нас з поўдня і ўсходу актыўна рухаецца яшчэ большая небяспека — амброзія палынналістая, якая правакуе развіццё алергіі.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

«ДЗЯКУЙ ЗА ПЕРАМОГУ!»

Маладзёжная патрыятычная акцыя Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі пад такой назвай пройдзе ў краіне з 3 па 11 мая.

Сімвалам патрыятычнага праекта стане чырвоная зорка з надпісам «Дзякуй за Перамогу!», якой у знак удзячнасці і павагі да гераічнага мінулага ўдзельнікі акцыі ўпрыгожаць дзверы дамоў і кватэр, дзе сёння пражываюць удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны. У рамках мерапрыемстваў праекта — вахты памяці, мітынгі, творчыя фестывалі, конкурсы патрыятычнай песні, канцэрты, сустрэчы юных грамадзян з ветэранамі. Цікавым абяцае быць праект «Героі Перамогі» — пошукава-даследчыцкая работа моладзі па вывучэнні біяграфій і подзвігаў Герояў Савецкага Саюза, ураджэнцаў Беларусі.

Стартуе праект «Дзякуй за Перамогу!» каля манумента Перамогі ў сталіцы. Да яго далучацца ўдзельнікі міжнароднага злёту рэтра і класічных аўтамабіляў «Рэтра-Мінск 2014» з Беларусі, а таксама краін блізкага і далёкага замежжа — больш за 50 экіпажаў аўтааматараў. Разам з моладдзю яны ўскладуць кветкі да манумента Перамогі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

МАГІЛЁЎ ІМІ ГАНАРЫЦЦА

У дзень Першамая ў Магілёве віншавалі лепшых працаўнікоў вобласці. Падчас урачыстай цырымоніі ўручэння пасведчанняў аб занясенні на Дошку гонару былі адзначаны прозвішчы 55 пераможцаў. Сярод іх лаўрэаты прэміі «Чалавек года», пераможцы конкурсу «Лепшы прадпрымальнік» Магілёўскай вобласці, а таксама 24 прадпрыемствы, якія па выніках мінулага года дасягнулі найлепшых паказчыкаў.

— Гэта людзі, якія зрабілі вялікі ўнёсак у развіццё рэгіёна, і мы імі ганарымся, — адзначыў у сваім віншавальным слове **старшыня Магілёўскага аблвыканкама Пётр РУДНІК.** — Раней Першамай адзначаўся як дзень салідарнасці працоўных. Сёння сэнс гэтага свята стаў значна глыбейшым: гэта даніна павагі ўсім людзям, якія працуюць на карысць сваёй Айчыны і роднага краю.

У гэты ж дзень у Магілёве пасля зімовага перапынку зноў запрацавалі фантаны, а ў гарадскім скверы зайграў духавы аркестр.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

ПАКЛОНІМСЯ ВЯЛІКІМ ТЫМ ГАДАМ...

Беларуска-расійская маладзёжная акцыя «Паклонімся вялікім тым гадам» распачалася ў Брэсцкай крэпасці. Прадстаўнікі студатрадаўскага руху БРСМ Брэстчыны і маладзёжнай агульнарасійскай грамадскай арганізацыі «Расійскія студэнцкія атрады» выказалі намер папрацаваць на добраўпарадкаванні тэрыторыі мемарыяльнага комплексу.

У Брэст прыехалі 60 удзельнікаў студатрадаў Расіі на чале з **камандзірам Цэнтральнага штаба РСА Міхаілам КІСЯЛЁВЫМ.** Вось што ён сказаў:

— Штогод нашы студатрадаўцы ўдзельнічаюць у патрыятычным праекце «Паклонімся вялікім тым гадам». Мы дапамагаем ветэранам, даглядаем памятныя мясціны. Летась працоўная акцыя прысвячалася 70-годдзю Сталінградскай бітвы.

А сёлета 70-ю гадавіну вызвалення ад фашызму адзначае Беларусь. І мы вырашылі правесці сваю працоўную акцыю ў Брэсцкай крэпасці-героі. Бо легендарная крэпасць — асаблівая мясціна не толькі для беларусаў, але і для расіян таксама.

Працоўную акцыю студэнты дзвюх краін пачалі з ускладання кветак да Вечнага агню, а затым узяліся за работу, фронт якой вызначыла кіраўніцтва мемарыяльнага комплексу.

Яна СВЕТАВА.

ВАЛОЖЫНСКІМІ ДАРОГАМІ — НА ВЕЛАСІПЕДЗЕ

Прэзентацыя веласіпеднага маршруту адбылася ў Валожынскім раёне.

Ён пройдзе ад станцыі Багданаў да станцыі Радашковічы. Гэты шлях з'яўляецца тэматычным працягам ужо існуючага пад назвай «Валожынскія гасцінцы». Гэта самы вядомы 220-кіламетровы зялёны маршрут Беларусі, які штогод прываблівае каля 10 тыс. турыстаў.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»

05 июня 2014 года проводит 11-ый открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности

Номера лотов	Наименование техники	Местонахождение объекта	Начальная цена продажи (бел. руб.)	Сумма задатка (бел. руб.)
174	Гусеничное шасси МТ-ЛБ ш. 497911001 дв. 968720 1979 г. 4 кат. 7411 км 405 м/ч	г. Минск, в/ч 63755	100 000 000	10 000 000
175	Грузовой Урал-4320-0011-01 ш. 152385 дв. 735390 1990 г. 3 кат. 118755 км	г. Баранович, в/ч 29969	45 000 000	4 500 000
176	Грузовой Урал-4320-0011-02 ш. 182545 дв. 838900 1991 г. 4 кат. 169452 км	г. Минск, в/ч 39872	40 000 000	4 000 000
177	Грузовой КамАЗ-43106 ш. 004949 дв. 0409039 1990 г. 3 кат. 103224 км	г. Минск, в/ч 39872	50 000 000	5 000 000
178	Грузовой КамАЗ-43105 ш. 0016991 дв. 748939 1988 г. 3 кат. 109182 км	г. Минск, в/ч 39872	50 000 000	5 000 000
179	Грузовой КрАЗ-255Б ш. 258437 дв. 0576 1976 г. 4 кат. 2341 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	38 000 000	3 800 000
180	Грузовой КрАЗ-255Б ш. 259325 дв. 0699 1976 г. 4 кат. 6726 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	40 000 000	4 000 000
181	Грузовой КрАЗ-255Б ш. 263654 дв. 0691 1976 г. 4 кат. 1680 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	45 000 000	4 500 000
182	Грузовой КрАЗ-255Б ш. 278204 дв. 423050 1976 г. 4 кат. 1326 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	30 000 000	3 000 000
183	Грузовой КрАЗ-255Б ш. 271408 дв. 18666 1976 г. 4 кат. 2350 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	42 000 000	4 200 000
184	АТМЗ-5-4320-1012 (автотопливомаслозаправщик) с/о1301 на УрАЛ-4320-1012 ш. 026075 дв. 619374 1984 г. 4 кат. 61551 км	н.п. Михановичи, в/ч 52188	115 000 000	11 500 000
185	АТМЗ-5,5-4310 (автотопливомаслозаправщик) с/о 890234 на КамАЗ-4310 ш. 0056945 дв. 0386657 1989 г. 4 кат. 53901 км	н.п. Михановичи, в/ч 52188	125 000 000	12 500 000
186	Грузовой КамАЗ-4310 1986 г. шасси № 431000С0020760 дв. № 923815 пробег 114 923 км	в/г Околица, Минский р-н, в/ч 3310	60 000 000	6 000 000

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж **05 июня 2014 г. в 11.00.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток и подавшие заявление на участие в аукционе, учредительские и другие необходимые документы до **17.00 02 июня 2014 года**.

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3-х дней с момента проведения аукциона.

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение **5**-ти банковских дней для резидентов Республики Беларусь и **10**-ти банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток и денежные средства победителем лота перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012244970018 в ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр. Машерова, 29, код 153001739, УНП 101099370, БИК 153001369. **Без НДС. Справки по тел.: (017) 398 07 81, факс (017) 398 07 81. Наш адрес в интернете: www.bsk.by, mail@bsk.by.**

Алена КУПЧЫК:

«ПРА ТОЕ, ЯК Я ПАЧЫНАЛА ПРАЦАВАЦЬ У КАДРЫ, МОЖНА СКЛАДАЦЬ АНЕКДОТЫ»

Яна з тых жанчын, якія ўмеюць адстойваць сваю пазіцыю і ўласныя інтарэсы. Па яе версіі, усё атрымліваецца ў жыцці тады, калі не ісці супраць сябе і свайго сумлення. Схільная да самаіроніі, авантурызму і свабоды выражэння сябе ва ўсім. Аднойчы плануе напісаць кнігу для нашчадкаў і адкрыць сваю справу. А пакуль што выхоўвае дзіця, захапляецца аздабленнем мэблі і працуе на тэлебачанні. На тэлеканале «Мір» Алену Купчык можна ўбачыць у праграме «Агульны інтарэс» кожны панядзелак.

— Рыхтуючыся да інтэрв'ю, вельмі мала знайшла пра вас у сеціве. Гэта пазіцыя закрытасці ці асцярожнае стаўленне да публічнасці?

— Не, проста, калі я толькі пачынала працаваць, то была вельмі маладой. І ў нейкай ступені было рана знаходзіцца ў цэнтры ўвагі. А з прыходам на тэлеканал «Мір», дзе працую ўжо 12 гадоў, мабыць, таксама не было аб'ектыўных прычын «свяціцца», бо спачатку я вяла нейкія праекты, якія ствараліся толькі для расійскага вяшчання. Усё адбываецца вельмі правільна — кожнай падзеі свой час.

Наконт публічнасці, шчыра скажу, я не з тых, хто ставіцца да яе сур'ёзна. Мяне яна, хутчэй, забаўляе. У нас жа, хоць і з'явілася сфера тусовак і шоу-бізнесу, але ў ёй усе адзін аднаго ведаюць. Для мяне важна, каб была мяжа паміж асабістым жыццём і тым, чым я дзялюся са светам.

— Давайце аб прафесіі… Адкуль жаданне пайсці ў журналістыку?

— Смешная гісторыя была. Я вучылася ў спецыялізаванай школе і паглыблена вывучала іспанскую мову. Удзельнічала ў розных алімпіядах, але душа прасіла яшчэ нечага. І я разумела, што замежная мова без асноўнай прафесіі — не самы лепшы варыянт, бо добра мець нейкія веды як дадатак да асновы. І ў адзінаццатым класе, упэўненая, што паступаю на замежныя мовы, я пачала наведваць курсы падрыхтоўкі і пры гэтым паралельна пайшла на такія ж на журфаку. Нават бацькі не былі ў курсе маёй стратэгіі. У тым жа годзе я яшчэ ўдзельнічала ў рэспубліканскай алімпіядзе. А там была наступная сістэма: яе прызёры аўтаматычна маглі паступіць на адпаведны профіль ва ўніверсітэт. Выдзялялі адно месца на Мінск і пяць на рэгіёны. Я вырашыла: калі ўвайду ў шасцёрку, то паступаю на замежныя мовы. І, будзеце смяяцца, але я заняла сёмае месца. Бацькі тады вельмі перажывалі за мой выбар, але маўчалі. Так я трапіла на журфак. Цяпер такога авантурызму ўсё менш, а тады рызыкавала не раздумваючы.

Хочаш развіцця — прыдумвай сваё і новае.

— І якімі былі першыя крокі ў прафесіі?

— Я пачала працаваць у штаце на трэцім курсе. З'явілася разуменне таго, што шмат тэорыі і мала практыкі, таму, калі хачу займацца гэтай справай па жыцці, трэба здабываць практычны вопыт. А потым трапіла на тэлеканал «Мір», дзе былі маштабныя праекты, дакументальныя фільмы. Такую працу не параўнаць з навінамі і штодзённымі праектамі. Змагла навучыцца многім карысным рэчам. А веды, як вядома, за плячыма не насіць.

— «Проба сябе» ў кадры цяжка давалася?

— Пра тое, як я пачынала працаваць у кадры, можна складаць анекдоты. Я, можа, таму з пэўнай іроніяй стаўлюся сёння да «зорнасці» на экране. Падчас першых эфіраў у мяне на зубах стаялі брэкеты. Каб іх неяк замаскіраваць, я рабіла «вініры» з жавальнай гумкі. З-за гэтага ў пэўнай ступені змянялася манера гаварыць. Нават дзіўна, як пагаджалася на такія эксперыменты маё кіраўніцтва. А вось хваляванне заўсёды адсутнічала. Мне, праўда, не даводзілася працаваць у прамым эфіры. Там, кажуць, атрымліваеш ні з чым не параўнальны адрэналін. А праца ў запісе заўсёды дае магчымасць выправіць нейкія няўдачы, больш звяртаеш увагу на сваю дыкцыю, на тое, як трымаешся ў кадры, як падаеш матэрыял. Наогул, мне здаецца, усё гэта альбо ёсць у чалавеку, альбо няма...

— «Мір» з тых тэлеканалаў, куды не проста трапіць…

— Калі прыйшла сюды, то быццам нанова пачала вучыцца. Былі розныя праекты, назапашвала вопыт. Напрыклад, праграму «Мар! Дзейнічай! Будзь!» я прыдумала за вечар, таму што хацелася новых крокаў пасля праекта «Як жывяце-можаце» (гэта была серыя дакументальных праграм). А ў нас якая пазіцыя на канале: хочаш развіцця — прыдумвай сваё і новае. Тады якраз была замова з Масквы на маладзёжны праект. Я села і зрабіла. Працавала ў ім тры гады, потым сышла ў дэкрэт, вярнулася. На праграме змянілася каманда і фармат, але ён вось ужо восем гадоў жыве.

— Сёння вы ў праекце «Агульны інтарэс» разглядаеце актуальныя тэмы. Як удаецца знаходзіць герояў?

— У нас вельмі шчыльны графік падрыхтоўкі праграмы, і праца будуецца адпаведна. Мы з Андрэем (Андрэй Алексіенка — сувядучы.— **Аўт.**) па чарзе прыдумваем тэмы, распісваем, арыентуючыся на герояў. А вось шукае іх і дамаўляецца пра сустрэчу наш прадзюсар Таццяна Раманава. Класны герой забяспечвае поспех праграмы: здабыўшы добры матэрыял, потым і тэкст лёгка напісаць, і зманціраваць. Тады нават сама праграма глядзіцца на адным дыханні. Тэлебачанне — гэта вынік камандnай працы, дзе ад аднаго залежыць праца іншых. Я працую з цудоўнымі людзьмі. Вялікая ўдача, калі прысутнічае паразуменне з вядучым, рэжысёрам. Я, напрыклад, не магу дазволіць сабе не прачнуцца раніцай і не сесці за працу, бо ведаю, што іншыя калегі чакаюць.

— У вас праграма будуецца на супрацьлеглых пазіцыях. Калі здараецца, што герой выказвае сваё бачанне і яно адрозніваецца ад патрэбнага вам, то як «накіроўваеце» яго?

— Кіраваць любым чалавекам складана. Спачатку нават губляліся, сядзелі і думалі: на што мы страцілі час, як вывесці яго на патрэбныя думкі? Цяпер такіх момантаў ужо значна менш. Трэба рыхтавацца да любых паваротаў яшчэ на стадыі планавання, інакш такія недахопы спрацуюць нам у мінус. Стараемся больш дакладна акрэсліваць свае пазіцыі і размяжоўваць пункты гледжання герояў. У адной з нядаўніх праграм «пісалі» сямейную пару псіхолагаў і ўдалося падвесці іх да таго, што адзін спецыяліст быў на маім баку, а другі адстойваў пазіцыю майго сувядучага, хаця спачатку яны прытрымліваліся аднолькавых поглядаў.

— Ад чаго, на вашу думку, залежыць поспех таго ці іншага праекта сярод гледачоў?

— Па-першае, павінен быць фармат, якога няма на іншых каналах. Праект «Мар! Дзейнічай! Будзь!» не меў аналагаў ні ў нас, ні нават у Маскве. Яго глядзелі і глядзяць вось ужо восем гадоў — і добрыя рэйтынгі. Па-другое, трэба шукаць герояў. Калі чалавек ходзіць з канала на канал і расказвае пра адно і тое ж, то каму ён цікавы? Нарэшце, праца каманды — ад яе ж залежыць якасць здымкаў, мантаж і шмат іншых нюансаў.

Падчас першых эфіраў у мяне на зубах стаялі брэкеты. Каб іх неяк замаскіраваць, я рабіла «вініры» з жавальнай гумкі.

— Што для вас значыць быць журналістам?

— Я не стала б ідэалізаваць нашу прафесію. У нас такая спецыфіка працы... Зразумела, многае залежыць ад умення планаваць час. Але ў журналістыцы нельга пакінуць працу ў офісе і забыцца на яе да раніцы.

— У вас ёсць нейкая планка? Чаго хочацца дасягнуць у прафесіі?

— Я хацела паступіць у Маскву на рэжысёра. Але з часам зразумела: няма ў гэтым неабходнасці, бо, можа, трохі саманадзейна прагучыць, я шмат што ўжо ўмею рабіць. У мяне была магчымасць паспрабаваць сябе ў якасці і рэжысёра, і аўтара, і вядучай. Магу сама манціраваць, музыку падбіраць. Яшчэ прыйшла да высновы, што кар'ера, дасягненні — не самае галоўнае, і такая пазіцыя нармальная. Самае страшнае для мяне, калі людзі не развіваюцца.

Алена ДРАПКО.

■ Неасабісты суб'ектыў

ВЫКАРЫСТАНЫ ШАНЦ

Нітку жыцця можа перарэзаць толькі той, хто яе падвесіў. Але ёсць людзі, якія не даюць ёй абарвацца, калі яна становіцца тоненькай

6.50, 12.50, 0.25 Маст. фільм «Пунсовыя пагоны».
8.00, 14.00, 20.00, 2.00 «Мінулы час».
9.00, 15.00, 3.00 «Народжаныя ў СССР».
10.00 Кінаканцэрт «Спявае Андрэй Міронаў». 1988 год.
11.00 «...Да 16 і старэйшым». 1992 год.
11.50 «Відавочнае—неверагоднае». 1991 год.
16.00 Праграма «ТЭМА» з У. Лісцьевым: «Свабоднае каханне». 1992 год.
17.00 «Па старонках «Сатырыкона». Тэлеспектакль. 1976 год.
18.00 «Нью-Ёрк, Нью-Ёрк». 1995 год.
18.25 Тэлефільм «Следства вядуць Знатакі».
21.00 «Колба часу».
22.00 «Кінапанарама». 1979 год. 2-я частка.
22.40, 1.35 Канцэрт замежнай эстрады.
23.00 «Фантомы супраць уцеканцоў». Ліванскі рэпартаж. 1978 год.
23.35 «Арэна» выходзіць у эфір». Фільм-канцэрт. 1977 год.
4.00 «Да і пасля паўночы». 1987 год. 2-я частка.

EUROSPORT

9.30, 16.00 Веласпорт. Чатыры дні Дзюнкерка.
10.45, 14.45, 19.15 Веласпорт.
12.00, 18.00 Футбол. Чэмпіянат Еўропы для гульцоў (U-17).
14.00 Сніджвей.
19.30, 0.45 Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур Італіі.
23.45 Наймацнейшыя людзі планеты.

КАМЕДЫЯ

5.00, 10.55, 17.00, 19.00, 2.05 Скетчком «Паміж намі».
5.15, 8.00, 12.55, 16.00, 21.00, 2.20 Серыял «Гэта ўсё пра Джоан».
6.00, 7.45, 8.45, 12.40, 13.45, 16.45, 21.50, 23.50, 1.50, 3.00 «Камедыянты. Лепшае».
6.15 Камедыя «Адна жанчына або дзве».
9.00 Камедыя «Госць у доме».
11.15 Камедыя «Вайна прыгажунь».
14.10 Камедыя «Не дрэнна б пахудзець».
17.20 Мюзікл «Дарога на Балі».
19.20 Камедыя «Асілак Санта-Клаус».
22.10 Меладрама «Невыносная жорсткасць».
0.10 Меладрама «Ракавая красуня».
3.25 Камедыя «Два ў адным».

ТБ3

6.00 М/ф.
9.30 Маст. фільм «Яны змагаліся за Радзіму».
12.15 Дак. фільм «Чорная кроў».
13.00, 17.00, 0.10 Серыял «Кедр» пранізвае неба».
16.15, 23.30 Дак. фільм «Дзяцінства, апаленае вайной».
20.15 Драма «Мы з будучыні».

ТБ1000

5.00 Камедыя «Алекс і Эма».
7.00 Драма «Доказ».
9.00 Драма «Апошняя заслона».
10.50 Драма «Чалавек, якога не было».
13.00 Драма «Прах Анджэлы».
15.40, 1.00 Трагікамедыя «Тост».
17.20 Драма «Юнацтва, якое бунтуе».
19.00 Драма «Забароненае каханне».
21.00 Баявік «Вялікі куш».
23.00 Драма «Дрэва».
3.00 Драма «Дзівоснае спрыянне».

ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.10 Дэтэктыў «Прыгоды Шэрлака Холмса і доктара Ватсана: Скарбы Агры».
8.55 Драма «Верабей».
10.35 Драма «Рабінавы вальс».
12.25 Дэтэктыў «Прыгоды Шэрлака Холмса і доктара Ватсана».
15.20 Фантастыка «Туман».
18.00 Фантастыка «Туман 2».
22.00 Камедыя «2 дні».
23.50 Драма «Жыві і памятай».

NATIONAL GEOGRAPHIC

1.40 Дэтэктыў «Памылка рэзідэнта».
4.30 Камедыя «Імяніны».
5.00 Найцяжэйшы ў свеце рамонт.
6.00 Страчаны рай Афрыкі.
7.00, 16.00 Паляванне на паляўнічага.
8.00, 13.00 Дзікі тунец.
10.00 Прыроджаны байкер.
11.00 Скарбашукальнікі.
12.00, 19.00 Гульні розуму.
12.30, 19.30 Займальная навука.
15.00 Прыручыць дракона.
17.00, 2.00 Апакаліпсіс: Другая сусветная вайна.
18.00 Старацелі.
20.00, 0.00, 3.00 Космас: Прастора і час.
22.00 Ліхтугі за міжой.
23.00 Турэмныя цяжкасці.

DISCOVERY

7.00 Класіка з Паўднёвага пляжа.
7.50 Хлопцы з Юкана.
8.40, 20.35 Як гэта ўстроена?
9.10, 20.05, 4.45 Як гэта зроблена?
9.35 Адпетыя рыэлтары.
10.30 Top Gear.
11.25 Пераломны момант.
12.20 Марпех Дуг.
14.10, 16.00, 18.15, 3.55 Скарбашукальнікі Амерыкі.
21.00 Пяцёрка лепшых.
22.00 Неверагодны хмарачос.
23.00 Найбуйнейшы ў свеце карабель.
0.00, 5.10 Не спрабуйце паўтарыць.
0.55 Эверэст: за міжой магчымага.
1.50 Сапраўдныя аферысты.
2.40 Маланкавыя катастрофы.
3.05 Што ў вас у гаражы?
3.55 Амерыканскі чопер.
6.05 Махінатары.

СУБОТА, 10 МАЯ

БЕЛАРУСЬ 1

6.20 Існасць.
6.50 Маст. фільм «Легенда № 17».
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.10 Клуб рэдактараў.
9.50, 1.30 Серыял «Сваты 3».
10.50 «Пра ежу!».
11.25 Дача.
12.10 Давярай і правярай.
12.50 Здароўе.
13.35 Журналісцкае расследаванне.
14.10 Вакол планеты.
15.15 Навіны рэгіёна.
15.30 Нашы.
15.45 Давярай і правярай.
16.15, 2.25 «Вялікая розніца».
17.20 Кінааповесць «Беларускі вакзал».
19.10 Меладрама «Начны госць».
21.00 Панарама.
22.00 Міжнародны конкурс песні «Еўрабачанне 2014». Фінал.
1.00 Чэмпіянат свету па хакеі 2014. Агляд гульнявога дня.
1.20 Дзень спорту.

БЕЛАРУСЬ 2

7.00 Маст. фільм «Прывітанне ад «Кацюшы».
10.20, 19.10 Тэлебарометр.
10.25 «Два з паловай кухары».
11.00, 23.05 Серыял «Інтэрны».
12.40 Хакей. Чэмпіянат свету. Італія — Нарвегія.
15.00 Вышэй за дах.
15.35 «Імперыя песні».
16.40 Хакей. Чэмпіянат свету. Швецыя — Данія.
19.15 Ваша лато.
19.55 Латарэя «Пяцёрачка».
20.05 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
20.40 Хакей. Чэмпіянат свету. Канада — Славакія. У перапынку: **21.15** КЕНО.
0.25 Драма «Глыбокае цячэнне».

БЕЛАРУСЬ 3

8.00, 12.45, 14.55, 17.05, 21.05, 0.40 «Калейдаскоп».
8.05, 12.55, 15.00, 0.45 «Сімвалы эпохі». Збор макулатуры.
8.20, 23.30 «Сіла веры».
8.45 «Вызваленне». Маст. фільм. Фільм чацвёрты. «Бітва за Берлін».
10.05 «Вызваленне». Маст. фільм. Фільм пяты. «Апошні штурм».
11.20 «Георгій Жукаў. Вайна і мір маршала Перамогі». Дак. фільм.
11.55 «Наперад у мінулае».
12.20 «Наперад у мінулае». Спецыяльны выпуск, прымеркаваны да «Еўрабачання».
13.05 «Два Фёдары». Маст. фільм.
14.30, 16.35 «Размаўляем па-беларуску».
14.35 М/ф.
15.15 «Чаклун і Румба». Маст. фільм.
16.40 «...І кружыцца планета Куляшова». Дак. фільм.
17.10 «Дні Турбіных». Маст. фільм.
20.45 Калыханка.
21.10 Сусветнае кіно. «Апошні рэйд».
23.55 «Быль і небыль пра маршала Ракасоўскага». Дак. фільм.

БЕЛАРУСЬ 5

8.00 Хакей. Чэмпіянат свету-2014. Швейцарыя — Расія.
9.50 Хакей. Чэмпіянат свету-2014. Беларусь — ЗША.
11.40 Хакей. Чэмпіянат свету-2014. Агляд гульнявога дня.
12.40 Хакей. Чэмпіянат свету-2014. Казахстан — Германія.
15.00 Футбол. Чэмпіянат Беларусі.
16.45 Хакей. Чэмпіянат свету-2014. Фінляндыя — Латвія.
19.10 Хакей. Чэмпіянат свету-2014. Агляд чатырох згуляных матчаў.
20.10 Хакей. Чэмпіянат свету-2014. Прэв'ю.
20.40 Хакей. Чэмпіянат свету-2014. ЗША — Швейцарыя.
23.00 — 2.00 Тэніс. Турнір ВТА. Мадрыд. Паўфіналы.
2.00 Еўрапейскі покерны тур.

АНТ

7.00 «Суботняя раніца».
8.00, 9.00, 16.00, 20.30 Нашы навіны.
9.05 М/с «Смяшарыкі». Новыя прыгоды.
9.20 «Здароўе».
10.25 «Смак».
11.05 «Леанід Быкаў. «Будзем жыць!».
12.05 «Разумніцы і разумнікі».
12.50 «У некаторым царстве». М/ф.
13.30 Камедыя «Пакроўскія вароты».
16.15, 21.00 Навіны спорту.
16.20 Ералаш.
16.35 «Бацькоў у школу».
17.30 «Адзін супраць усіх».
18.20 «Акадэмія талентаў».
21.05 «Кропля ў кроплю».
23.55 Маст. фільм «Бездань».

СТБ

6.00 «Сакрэтныя тэрыторыі».
6.45 «Анфас».
7.00, 9.10, 12.35, 13.40, 17.35 Маст. фільм «Сямнаццаць імгненняў вясны».
9.00 «Гарачы лёд».
11.30 «Мінск і мінчане».
12.05 «Прыгоды дылетанта».
13.30, 16.30, 19.30 «24 гадзіны».
16.45 «Наша справа».
17.00 «Вялікі горад».
18.40 «Разумней не прыдумаеш».
20.00 «СТБ-спорт».
20.10, 20.40 Маст. фільм «Сляды апосталаў».
20.30 «Гарачы лёд».
22.35 «Тайны горад». Серыял.

МІР

5.00 М/ф.
7.25 Маст. фільм «Ляцяць жураўлі».
9.00, 15.00 Навіны Садружнасці (бягучы радок).
9.10, 23.15 Маст. фільм «Фронт без флангаў».
12.05, 2.05 Маст. фільм «Фронт за лініяй фронту».
15.10 Маст. фільм «Беларускі вакзал».
16.55 Серыял «Неба ў агні».
21.15 Маст. фільм «Свае».

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 Маст. фільм «Печнікі».
8.35 Маст. фільм «Ненаглядны мой».
10.20 «Раніцяная пошта».
11.00, 14.00, 20.00 Весткі.
11.10 «Суботнік».
11.50 «Планета сабак».
12.25 Маст. фільм «Сустрэча перад расстаннем».
14.15, 20.35 Серыял «Попел».
19.00 «Карціна свету».
19.55 Надвор'е на тыдзень.
23.50 1/8 фіналу Цэнтральнай Міжнароднай лігі КВЗ.

НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.25 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».
8.00, 10.00, 13.00, 19.00 Сёння.
8.20 «Дзікі свет».
8.50 «Іх норавы».
9.25 «Справа густу».
10.20 «Галоўная дарога».
10.50 «Кулінарны паядынак».
11.55 «Кватэрнае пытанне».
13.20 «Таямнічая Расія».
14.05, 19.20 Серыял «Кодэкс гонару».
21.00 Баявік «Пацалунак у галаву».
22.55 Баявік «Карнік».
0.55 «Авіятары».

8 КАНАЛ

9.00, 13.35, 19.05, 20.55, 23.45 «Надвор'е».
9.05 Мультпарад.
9.15 Серыял «Плашч».
10.50 «Даведнік па краінах і кантынентах».
11.00 Серыял «Сакрэтны фарватар».
13.40 Драма «Чырвоны какаду».
15.50 «Кінаблакнот».
16.00 «Адшукваецца адпачынак».
16.30 Камедыя «Аднакласніцы».
18.15 Серыял «Паліцыя Гаваяў».
19.10 Меладрама «Птушыная песня», 1-я серыя.
20.45 «Вечарніца».
21.00 «Неверагодная магія».
21.10 Драма «Шлях дадому».

ВТБ

6.00, 1.00 «PLAY».
8.30 М/ф «Смяшарыкі».
9.00 Серыял «Татавы дочкі».
10.00 «Міксер».
12.00 «Спытайце кухара».
13.00 Серыял «Думай як жанчына».
15.00 М/ф «Замбезія».
16.15 Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
17.00, 0.00 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
17.30, 22.45 «Уральскія пельмені».
19.00 Серыял «Кухня».
20.30 Камедыя «ALL INCLUSIVE, або Усё ўключана».
0.30 «Лаві момант».

КУЛЬТУРА

5.30 «Еўраньюс».
9.00 «Позняя сустрэча». Маст. фільм.
10.25 «Легенды сусветнага кіно». Аляксей Баталаў.
10.55 Да 90-годдзя з дня нараджэння Булата Акуджавы. Вялікая сям'я.
11.50 «Булат Акуджава. Цэлае стагоддзе іграе музыка».
12.35 Пернікавы домік. «Гадзіннік з зязюляй».
13.05 «Каштоўныя пасланцы кветак». Дак. фільм.
14.00 Спектакль Тэатра п/к А. Табакова «Сублімацыя кахання».
16.00 «Больш, чым каханне». Юлія Друніна і Аляксей Каплер.
16.40 «Рамантыка раманса». Спяваюць акцёры тэатра і кіно.
17.35 «Яўген Мацвееў». Дак. фільм.
18.15 «Дом, у якім я жыву». Маст. фільм.
19.50 Аляксандра Пахмутава. Творчы вечар у Маскоўскім міжнародным Доме музыкі.
21.20 Кіно на ўсе часы. «Надзея і Слава». Маст. фільм.
23.15 Соль Габета, Генія Кюхмаер, Сабіна Меер. Гала-канцэрт у аўстрыйскім замку Графенег.
0.20 «На Поўдзень ад Поўначы». «Ліфт». М/ф для дарослых.
0.55 «Каштоўныя пасланцы кветак». Дак. фільм.
1.50 «Поль Гаген». Дак. Фільм.

НАСТАЛЬГІЯ

5.00 «...Да 16 і старэйшым». 1992 год.
5.50 «Відавочнае—неверагоднае». 1991 год.
6.50, 0.50 Маст. фільм «Пунсовыя пагоны».
8.00, 14.00, 2.00 «Мінулы час».
9.00, 3.00 «Народжаныя ў СССР».
10.00 Праграма «ТЭМА» з У. Лісцьевым: «Свабоднае каханне». 1992 год.
11.00 «Па старонках «Сатырыкона». Тэлеспектакль. 1976 год.
12.00 «Нью-Ёрк, Нью-Ёрк». 1995 год.
12.25 Тэлефільм «Следства вядуць знатакі».
15.00 «Колба часу».
16.00 «Кінапанарама». 1979 год. 2-я частка.
16.40 Канцэрт замежнай эстрады.
17.00 «Што? Дзе? Калі?». 2-я міжнародная гульня. 1988 год.
18.50 «Сустрэчы ў канцэртнай зале гасцініцы «Космас». 1991 год.
20.30 «Вакол смеху» «Вялікі горад». 1980 год. 1-я частка.
21.20 Маст. фільм «Дуэнья».
23.00 «Шэсць песень на «біс»-II. 1993 год.
23.45 «Падарожжа па Маскве». 1984 год.
0.15 М/ф «Дзядзечка Ау». 1979 год.
4.00 Кінаканцэрт «Спявае Андрэй Міронаў». 1988 год.

EUROSPORT

9.30, 18.30, 0.30 Веласпорт. Чатыры дні Дзюнкерка.
10.30, 14.30, 23.00 Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур Італіі.
12.00 Тэніс. Рыхтуемся да «Ралан Гарос».
12.15 Футбол. Чэмпіянат Еўропы для гульцоў (U-17).
20.00, 1.30 Сніджвей. Лепшыя пары Еўраспорт.
0.10 Конны спорт. Скачкі.

КАМЕДЫЯ

5.00, 10.55, 17.00, 19.00, 2.05 Скетчком «Паміж намі».
5.15, 12.55, 21.00 Камедыя «Ноч напралёт».
5.55, 13.40, 21.40 Камедыя «Чарлі на забаўляльным мерапрыемстве, або Пярэпалах на танцпляцоўцы».
6.15 Камедыя «Вайна прыгажунь».
7.40, 10.40, 13.50, 15.45, 21.50 «Камедыянты. Лепшае».
8.00, 16.00, 2.20 Камедыя «Банк».
8.30, 16.30, 2.45 Камедыя «Граф».
9.00 Камедыя «Не дрэнна б пахудзець».
11.15 Мюзікл «Дарога на Балі».
14.10 Меладрама «Невыносная жорсткасць».
17.20 Камедыя «Асілак Санта-Клаус».
19.20 Камедыя «Ужо хто б казаў-3».
22.10 Камедыя «Жаніх напракат».
0.10 Камедыя «Госць у доме».
3.25 Камедыя «Адна жанчына або дзве».

ТБ3

6.00 М/ф.
9.50 Серыял «Сябры».
10.45 «Сардэчна запрашаем дадому!».
11.30, 15.45, 0.00, 3.20 Дэтэктыў «Месца сустрэчы змяніць нельга».
15.15 «Таямніцы нашага кіно. «Месца сустрэчы змяніць нельга».
18.45 Драма «Я дачакаюся».
22.00 Меладрама «Замыкаючы круг».

ТБ1000

5.00 Драма «Апошняя заслона».
6.40 Драма «Чалавек, якога не было».
8.50 Драма «Юнацтва, якое бунтуе».
10.30 Маст. фільм «Аксана ў краіне цудаў».
12.20 Драма «Радыё».
14.15 Камедыя «Дзённікі нянькі».
16.10 Драма «Патрыёт».
19.00 Камедыя «Калі свяkроў — монстр».
20.50 Трагікамедыя «Гуманітарныя навукі».
22.40 Драма «Дзівоснае спрыянне».
0.45 Драма «Парфумер: Гісторыя аднаго забойцы».
3.05 Драма «Асабістае».

ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.15 Дэтэктыў «Шэрлак Холмс і доктар Ватсан: Знаёмства».
7.35 Дэтэктыў «Шэрлак Холмс і доктар Ватсан: Крывавы надпіс».
8.55 Дэтэктыў «Шэрлак Холмс і доктар Ватсан: Смяротная сутычка».
10.10 Дэтэктыў «Шэрлак Холмс і доктар Ватсан: Каралева шантажу».
11.25 Дэтэктыў «Шэрлак Холмс і доктар Ватсан: Паляванне на тыгра».
12.40 Дэтэктыў «Прыгоды Шэрлака Холмса і доктара Ватсана: Скарбы Агры».
18.20 Меладрама «Пацалунак скрозь сцяну».
20.00 Драма «Вышыня 89».
22.00 Камедыя «З новым годам, мамы!».
23.40 Драма «Слон».
1.30 Драма «Верабей».
3.10 Трылер «Рускі трохвугольнік».

NATIONAL GEOGRAPHIC

5.00 Найцяжэйшы ў свеце рамонт.
7.00 З пункту гледжання навукі.
9.00 Гульні розуму.
10.00 Займальная навука.
11.00 Космас: Прастора і час.
12.00 Супербудаванні Трэцяга рэйха.
13.00 Апакаліпсіс: Другая сусветная вайна.
14.00 Дзікая прырода Амазонкі.
15.00 Тайнае жыццё драпежнікаў.
16.00 Старацелі.
17.00 Прыроджаны байкер.
19.00 Славіць сома.
20.00, 0.00, 3.00 Дзікі тунец.
22.00, 2.00 Забароны.

DISCOVERY

7.00 Як гэта ўстроена?
7.25, 19.10 Рэальныя дальнабойшчыкі.
8.15, 13.40 Хуткія і гучныя.
9.10, 2.40 Голыя і напалоханыя.
10.05, 17.20 Залатая ліхаманка.
11.00, 6.05 Ліквідатар.
11.50 Паляўнічыя на рэлікві — ламбард.
12.45, 5.10 Гульні ў ламбардзе.
14.35 Калекцыянеры аўто.
15.30 Махінатары.
16.25 Круцей не прыдумаеш.
18.15, 3.30 Золата льдоў.
20.05 Эд Стафард: як выжыць на незаселеным востраве.
21.00 Хлопцы з гарматамі.
22.00 Федэральная паліцыя Аўстраліі.
23.00 Мафія раёнаў.
0.00 Неверагодны хмарачос.
0.55 Найбуйнейшы ў свеце карабель.
1.50 Пяцёрка лепшых.
4.20 Маланкавыя катастрофы.
4.45 Як гэта зроблена?

НЯДЗЕЛЯ, 11 МАЯ

БЕЛАРУСЬ 1

7.05 Камедыя «Пяць нявест».
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.10 Арсенал.
9.40, 0.50 Серыял «Сваты 3».
10.50 «Пра ежу!».
11.25 «XXL WOMAN TV».
12.10 Навіны. Цэнтральны рэгіён.
12.35 Журналісцкае расследаванне.
13.15 Каробка перадач.
13.50 Тайны следства.
14.30 БеларусьLIFE.
15.15 Твой горад.
15.30 Eurovision. Вынікі тыдня.
15.50 «Зорнае жыццё». «Нечаканыя выбраннікі зорак». Частка 1-я.
17.05 Драма «Трэцяя сусветная».
21.00 Галоўны эфір.
21.55 Навіны надвор'я.
22.15 Камедыя «Мой хлопец — псіх!».
0.25 Чэмпіянат свету па хакеі 2014. Агляд гульнявога

БЕЛАРУСЬ 2

7.15 Маст. фільм «Аты-баты, ішлі салдаты...».
8.45, 16.40 Тэлебарометр.
8.50 Заўтра — гэта мы!
9.15 Беларуская кухня.
10.00 «Два з паловай кухары. Адкрытая кухня».
10.35, 23.05 Серыял «Інтэрны».
12.40 Хакей. Чэмпіянат свету. Францыя — Італія.
15.05 Аўтабатл.
15.40 Стыль-бюро.
16.20 «Кіпень».
17.25 Хакей. Чэмпіянат свету. Беларусь — Казахстан.
19.45 Суперлато.
20.40 Хакей. Чэмпіянат свету. Швецыя — Чэхія. У перапынках: 21.15 Спортлато 5 з 36, КЕНО.
0.50 «Comedy woman».

БЕЛАРУСЬ 3

8.00, 11.45, 13.25, 15.25, 21.05, 0.25 «Калейдаскоп».
8.05, 11.55, 13.35, 15.30, 0.30 «Галасы з мінулага». 115 гадоў з дня нараджэння народнага артыста Беларусі Глеба Паўлавіча Глебава.
8.15 «Дні Турбіных». Маст. фільм.
12.00 «Быль і небыль пра маршала Ракасоўскага» Дак. фільм.
12.45 «Нацыянальная трылогія: гімн, герб, сцяг». Дак. фільм.
13.40 Арам Хачатуран. «Спартак». Балет Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета.
15.35 «Непаўторны талент». Жыццё і творчасць народнага артыста Беларусі Г.П. Глебава.
16.05 М/ф.
16.10 «Наперад у мінулае».
16.40 Дзіцячы фільм. «Іван Макаравіч».
18.00, 22.45 «Культпрасвет».
18.30 Сусветнае кіно. «Апошні рэйд».
20.45 Калыханка.
21.10 «За любімую Беларусь!». Канцэрт ансамбля «Сябры» з удзелам С. Герасімава, Аляксея Хлястова, Пятра Ялфімава, Паліны Смолавай, Алесі, гурта «Тяни-Толкай».
23.10 «Здурнелы Журдэн». Спектакль Гродзенскага аб

■ Роздум пісьменніка

ПАРА́? ПАРА́!



Колькасць наркаманаў расце. І не трэба думаць, што гэта «не нашы дзеці»

Умінулыя гады і цяпер з нагоды выпускных вечароў каля школ загадамі выканкамаў забараняецца продаж спіртнога.

Апошнім часам патрэбны іншыя захады, бо становішча ўжо нашмат сур'ёзней. Да школ, апранутыя як на свята, нахабна падыходзяць маладыя, упэўненыя ў сабе асобы. І прапануюць яны не віно альбо гарэлку, а так званыя курыльныя сумесі.

Днямі сустрэў знаёмага ў змрочным стане.

— Пляменніка пахаваў, — адказаў ён на маё пытанне. — І вось што жахліва: таму было толькі дваццаць пяць гадоў, метр дзевяноста, спартсмен, не піў і не курыў».

— І што здарылася? — пацікавіўся я.

— Пайшоў да сваёй каханкі, і тая прапанавала яму так званую «марку». Паспытаць — што гэта за рэч. Сама не рызыкнула, а яму ўпхнула. Слабо, маўляў? Ну той і пачаставаўся. Праз паўгадзіны — кома. А праз месяц — у магілу.

На пахаванні тая «сяброўка» плакала і рвала на сабе валасы. Але ж былога не вернеш…

Наркаманія і ўвогуле наркатрафік, мутная плынь якога з небывалай сілай закранула ўвесь Стары і Новы свет, дасягнула Беларусі. Да вядомых опіумных наркотыкаў далучаюцца куды больш небяспечныя «маркі» і «спайсы». Гэтыя звышмоцныя псіхатропныя рэчывы прасочваюцца да нас з-за мяжы. Краіна ў апошні час літаральна агаломшана хваляй самазабойстваў, забойстваў і псіхічных вар'яцтваў, шаленстваў на гэтай глебе.

Паклаў пад язык такую «марку», альбо выкурыў «касячок» — і пайшоў у акно праз шкло з дзясятага паверха сам ці за кампанію з сяброўкай. Пасля першай спробы знаёмства са «спайсам» падлеткі часта адразу адпраўляюцца ў знакамітую псіхбальніцу ў Навінках. З перспектывай ужо ніколі не вярнуцца да нармальнага стану.

У знакамітай фантастычный аповесці братоў Стругацкіх «Слімак на схіле» — на маю думку, аднаго з лепшых фантастычных твораў мінулага стагоддзя, — апісана сітуацыя, калі ахвяра катастрофы, герой па мянушцы Маўчун, які пакутуе на амнезію, трапляе ў невядомы свет, у чужую цывілізацыю. Там з лесу да абарыгенаў прыходзяць мерцвякі — біяробаты, мэта якіх — выкрадаць жанчын. «Маўчун!» — адразу клічуць мясцовыя, і той выцягвае з-за пазухі скальпель і распраўляецца з біяробатамі.

Прыкладна тое ж здзейсніў нядаўна ў дачыненні да свайго сябра-наркамана адзін са спажыўцоў «спайсу» (разам курылі) — распаласаваў нажом, каб пацікавіцца, ці не з'яўляецца той біяробатам. А потым і сябе зададно праверыў, зрабіўшы сэпуку (ці харакіры) — вываліў свае вантробы з жывата і пачаў іх разглядваць.

Каля бальніц цяпер нярэдка можна сустрэць малалетак, якія просяць грошай, — гэта наркаманы.

— Дзядзечка (цётачка)! Дайце колькі грошай — галадаю!

Яны ўцякаюць цераз плот з наркалагічных аддзяленняў, жабруюць, каб набыць дозу, а потым — зноў у бальніцу.

Трагедыя ў тым, што ў такіх падлеткаў залежнасць ад наркотыкаў ужо сфарміравалася, і фінал прагназуецца аднолькавы: перадазіроўка — і ў лепшы свет…

Іх выратаванне нельга ўскладаць толькі на бацькоў, бо гэта не мае сэнсу ў большасці выпадкаў.

Знаёмы ўрач саджаў сына на ланцуг і прычэплівў да радыятара наручнікамі. Не дапамагло. Вызвалены праз месяц, ён адразу загінуў ад перадазіроўкі.

Летась на адным з тэлефорумаў праваслаўны святар П. Смірноў прапанаваў «бамбіць опіумныя плантацыі Афганістана».

Вядома, што наркатрафік лабіруюць шматлікія міжнародныя структуры, і такі метад наўрад ці знойдзе падтрымку. Але бясконца здзіўляе тое, што чалавецтва засвоіла космас, здзейсніла неверагоднае — палёты на Месяц, а вось пакараць па максімуме пастаўшчыкоў і распаўсюджвальнікаў «спайсаў» ды «марак» — усё яшчэ слабо. Быццам не бачаць, што робіцца пад носам, не могуць даць ім рады. У шмат якіх краінах свету, тым не менш, за распаўсюджванне і гандаль «наркатой» выносяць прысуды ад вельмі працяглых тэрмінаў зняволення да смяротных. У Кітаі, Сінгапуры, Іране і многіх іншых краінах. Гэтак жа, як, скажам, за педафілію і г. д.

Парламент нашай краіны абяцае ўдасканаліць заканадаўства супраць наркатрафіку ў больш жорсткім кірунку. Даўно трэба. Па сведчаннях супрацоўнікаў аддзелаў па барацьбе з наркаманіяй, амаль у кожным шматкватэрным доме ў гарадах краіны ўжо ёсць адна-дзве кватэры, дзе гандлююць наркотыкамі ці ўжываюць іх. У выніку небяспека распаўсюджваецца не толькі на гэты дом, але і на ўвесь раён.

Кожны з нас сутыкаецца з уплывам наркаманіі на наша жыццё. Неяк незаўважна яна ўвайшла ў нашу паўсядзённасць. Хто з нас не сустракаў маладых людзей з дзіўным позіркам і неадэкватнымі паводзінамі? Мы пакуль яшчэ не асэнсоўваем да канца ўсёй небяспекі такіх сустрэч…

Барацьбу супраць наркаманіі павінны актыўна ўключыцца прадстаўнікі мастацтва, літаратуры, кіно. А нашай цэнзуры варта крыху змяніць кірунак і больш увагі надаваць абмежаванню трансляцыі стужак для маладзёжнай аўдыторыі, у якіх відавочна (ці скрыта!) укараняецца ў падсвядомасць спосаб жыцця, неразрыўна звязаны з наркотыкамі і алкаголем.

Безумоўна, варта спяшацца. Колькасць наркаманаў расце. І не трэба думаць, што гэта «не нашы дзеці». І не варта цырыміцца і азірацца на славутую паліткарэктнасць.

Наркадылеры павінны атрымліваць самыя жорсткія пакаранні — аж да смяротнага. Як-небудзь перажывём істэрычны віск лібералаў і іх агентаў уплыву.

Падзеі нядаўніх дзён гавораць самі за сябе: нават Еўропа пачынае абуджацца ад левых ідэй. Таму сведчаць, напрыклад, падзеі ў Францыі, дзе левыя губляюць уладу, а ў шматлікіх гарадах выбаршчыкі галасуюць за правы сектар і яго лідара — Марын Ле Пэн.

Таксама сур'ёзна падыходзяць апошнім часам да гэтай надзвычай актуальнай праблемы ў Швейцарыі, Вугоршчыне, Фінляндыі.

Мяркую, і беларусы, калі прымуць адэкватныя меры супраць славутага лібералізму і мультыкультуралізму і іх наступстваў, прымусяць толькі паважаць сябе. Інакш любую краіну можна захапіць і знішчыць яе этнічны рэсурс не танкамі і самалётамі ды ўводам вайскоўцаў. Можна проста навадніць якімі дробненькімі «маркамі» — амаль без вагі, якія неабдумана кладуцца дурнямі пад язык. Над гэтым і варта задумацца. І неадкладна дзейнічаць.

Калі праваахоўнікі ведаюць, з-за якіх межаў да нас плывуць наркотыкі, чаму не прымаюць адпаведныя меры?

Міліцыя павінна дзейнічаць на апярэджанне, але гэта ім дазволяць зрабіць больш дасканалыя законы. Урэшце саміх наркаманаў варта затрымліваць тут жа ў прытонах і прымяняць да іх жорсткія меры пакарання.

«Пара!» — як казалі ў крытычных сітуацыях старажытныя героі Уладзіміра Караткевіча, узятыя, дарэчы, з рэальных гістарычных падзей.

І нам — пара!

Юры СТАНКЕВІЧ

■ Сядзі і глядзі

ДА СВЯТАЎ — З ПЕСНЯМІ

Белтэлерадыёкампанія, тэлеканал «Беларусь 3» і Маладзёжны тэатр эстрады рыхтуюць арыгінальнае віншаванне — канцэрт у рамках праекта «100 песень для Беларусі», прысвечаны Дню працаўнікоў тэлебачання, радыё і сувязі. Удзел у ім бяруць выканаўцы, якія запісалі для праграмы «Наперад у мінулае» сучасныя версіі аўтэнтычных народных песень.

— Праект існуе ўжо больш за два гады, назбіралася шмат песень, і стала зразумела, што можна і трэба фарміраваць нармальную канцэртную праграму, — адзначыў намеснік галоўнага дырэктара тэлеканала «Беларусь 3» Сяргей Макарэй. — Першы такі канцэрт мы зрабілі на навагоднюю ноч, ён меў рэзананс і знайшоў сваіх прыхільнікаў, таму вырашылі рабіць гэта традыцыйна. У перспектыве плануем ладзіць такія канцэрты і з нагоды іншых падзей.

Музычныя падарункі ў першым аддзяленні будуць дарыць Вольга Плотнікава, Алена Грышанава, Жанет, Наталля Тамела, Галіна Шышкова, гурты «Дразды», «Інжыр», «Аўра» і шэраг іншых артыстаў. А ў другім аддзяленні выступіць ансамбль народнай музыкі «Бяседа» Белтэлерадыёкампаніі (мастацкі кіраўнік — народны артыст Беларусі Леанід Захлеўны).

Весці канцэрт будзе нязменная вядучая праекта «Наперад у мінулае» Аксана Вечар у пары з удзельнікамі дзейства Тарыелам Майсурадзэ, Андрэем Хлястовым, Віталем Карпанавым і Кірылам Ермаковым.

— У канцэрце атрымала працяг ідэя «100 песень для Беларусі», — кажа вядучая Аксана Вечар. — Хочацца такое ж свята зладзіць да Дня абароны дзяцей. А цяпер кулуарна адзначым прафесійнае свята тых, хто працуе на радыё і тэлебачанні.

Тэлеверсію свята можна будзе паглядзець 7 мая на тэлеканале «Беларусь 3» і спадарожнікавым канале «Беларусь 24». Прыемным сюрпрызам, безумоўна, будзе і радыёверсія канцэрта, якая плануецца на 8 мая.

Алена ДРАПКО

■ Узровень

ХМЕЛЬНАЯ ГОРЫЧ З ВІШНЁВЫМ СМАКАМ

Мінулы год аказаўся лепшым для ААТ «Лідскае піва» за ўсю гісторыю існавання завода. Нягледзячы на тое, што піўная галіна ў цэлым знаходзіцца ў стагнацыі, прадпрыемства асвоіла чарговы транш інвестыцый у памеры 5,5 млн еўра для развіцця вытворчасці і лагістыкі. У выніку выраслі аб'ёмы рэалізацыі піва, безалкагольных напояў і вады, а таксама экспарт піва і квасу.

Паводле слоў генеральнага дырэктара ААТ «Лідскае піва» Аўдрыуса МІКШЫСА, рынак піва скараціўся летась на 3 працэнты, аднак кампанія прадэманстравала рост продажу на ўзроўні амаль 10 працэнтаў. У катэгорыі «квас» на айчынным рынку кампанія пакідае за сабой долю ў 60 працэнтаў. Такое лідарства захоўваецца ўжо сем гадоў запар. Летась «Лідскае піва» парадавала спажыўца і шэрагам навінак: півам Koronet і Sandels, напоямі «Усе вітаміны» са смакам «гранат», Angry Birds Paradise, Dynami: t Juice, кактэйлем Cuba Libre.

— Сёлета мы таксама будзем развівацца і расці: інвестыцыі ў вытворчасць і лагістыку складуць прыкладна 10 млн еўра, — кажа спадар Мікшыс. — У самы бліжэйшы час парадуем аматараў нашай маркі новымі рэцэптамі піва. Гэта новая катэгорыя для беларускіх піваварных прадпрыемстваў — «крафтавае» піва. Яго яшчэ называюць рамесным, або «півам майстра», бо яно варыцца невялікімі партыямі па традыцыйнай тэхналогіі з дадаваннем нетрадыцыйных інгрэдыентаў, якія ўзмацняюць, паляпшаюць смак і якасць піва…

У сталічных гіпермаркетах ужо можна набыць першыя «крафт»-навінкі — піва «Лідскае» і «Вечар у Бруге». Абедзве маркі маюць абмежаваны «тыраж». Іх стваральнік, галоўны піявар кампаніі Дзмітрый Нічыпар кажа, што «крафтавае» піва «Лідскае» — гэта інтэрпрэтацыя піва «Баварскае», якое варыла ў XIX стагоддзі сям'я Пупко, заснавальнікаў Лідскага завода. «Вечар у Бруге» — па сутнасці, бельгійскае піва з гарманічным спалучэннем хмельнай горычы і вішнёвага смаку. На яго стварэнне Дзмітрыя натхніла вучоба ў Скандынаўскай акадэміі піваварэння, падчас якой ён пазнаёміўся з бельгійскім традыцыйным фруктовым ламбікам.

Невялікія партыі «крафтавага» піва плануецца абнаўляць кожныя паўгода.

Дарэчы, гэта не ўсё. ААТ «Лідскае піва» і сусветны лідар піваварэння Warsteiner International KG падпісалі пагадненне аб супрацоўніцтве. Нямецкая кампанія даверыла беларускаму прадпрыемству выраб і рэалізацыю піва прэміум-сегмента Warsteiner Premium Verum. Такім чынам, ААТ «Лідскае піва» стала 3-м заводам у свеце, які вырабляе піва Warsteiner па ліцэнзіі.

— Піва Warsteiner вырабляецца па арыгінальнай тэхналогіі ў адпаведнасці з нямецкім «Законам аб чысціні піваварэння 1516 года», — сказаў на прэс-канферэнцыі ў Мінску тэхнічны дырэктар па міжнародных праектах Warsteiner Томас НЁСНЕР. — Якасць нашага прадукту павінна быць адзінай ва ўсім свеце, таму мы прад'яўляем строгія патрабаванні і да працэсу вытворчасці, і да кожнага інгрэдыенту. «Лідскае піва» поўнасцю адпавядае ўсім неабходным тэхналагічным паказчыкам для вытворчасці сапраўднага смаку Warsteiner Premium Verum.

У вытворчасці ліцэнзійнага прадукту выкарыстоўваюцца беларускія і нямецкія інгрэдыенты. Вада з артэзіянскай свідравіны праходзіць некалькі этапаў змякчэння. Солад адбіраўся ААТ «Белсолад» па спецпатрабаваннях кампаніі Warsteiner. Сумесь хмеляў гатуецца непасрэдна на заводзе ў горадзе Варштайн. Дрожджы таксама дастаўляюцца з Германіі.

Кампанія Warsteiner вось ужо 260 гадоў (а гэта дзевяць пакаленняў запар) варыць піва па сямейным рэцэпце. Новы прадукт у сегменце International Premium ужо можна набыць у сталічных гіпермаркетах (рэкамендаваны кошт адной бутэлькі — каля 22 тысяч рублёў).

Святлана БАРЫСЕНКА

ГАРАСКОП СТРЫЖАК НА МАЙ

3 мая, субота. Стрыжка ў гэты дзень можа палепшыць ваш матэрыяльны стан, але валасы не будуць трымаць форму і могуць стаць непаслухмянымі.

4 мая, нядзеля. Варта адмовіцца ад стрыжкі, але калі вы ўсё ж адважыліся на яе, лепш зрабіць кароткую.

5 мая, панядзелак. Неспрыяльны дзень для стрыжкі і афарбоўвання, але можна заняцца лячэннем і аднаўленнем валасоў.

6 мая, аўторак. Выдатны дзень для стрыжкі, яна не толькі надасць вам дадатковую прывабнасць, але і палепшыць вашы асабістыя справы. Афарбоўку лепш адкласці — вынік можа расчараваць.

7 мая, серада. Стрыжка і афарбоўванне могуць наклікаць праблемы са здароўем і фінансамі.

8 мая, чацвер. Пасля стрыжкі ў гэты дзень валасы даўжэй трымаюць форму і захоўваюць прыгажосць.

9 мая, пятніца. Спрыяльны для стрыжкі дзень, нават невялікае падразанне кончыкаў, якія сякуцца, палепшыць ваша матэрыяльнае становішча і псіхалагічны стан. Фінансаваму дабрабыту паслужыць афарбоўка ў рудыя і залацістыя тоны.

10 мая, субота. Усе працэдуры з валасамі лепш адкласці.

11 мая, нядзеля. Дзень выдатна падыдзе для стрыжкі, але не для афарбоўвання. Стрыжка надасць валасам сілу і бляск.

12 мая, панядзелак. Дазваляецца зрабіць укладку і правесці аздараўленчыя працэдуры. Фарбавацца і стрыгчыся не пажадана.

13 мая, аўторак. Фарбаваць валасы можна натуральнымі сродкамі і ў натуральныя тоны, дазваляецца стрыжка.

14 мая, серада. Стрыжка валасоў узмоцніць вашу рэспектабельнасць. Вельмі кароткую стрыжку рабіць не варта, гэта можа выклікаць праблемы ў матэрыяльнай сферы.

15 мая, чацвер. Дзень вельмі неспрыяльны для працэдур з валасамі, максімум, што можна зрабіць — афарбаваць іх у цёмныя тоны.

16 мая, пятніца. Неспрыяльны для стрыжкі дзень, але можна афарбоўваць валасы ў светлыя і медныя колеры.

17 мая, субота. Дзень неспрыяльны для стрыжкі, валасы дазваляецца фарбаваць у свой звычайны колер, без лішніх эксперыментаў.

18 мая, нядзеля. Стрыжка, зробленая сёння, даўжэй захоўвае форму, спрыяе росту і ўмацаванню валасоў. Фарбаваць валасы лепш у светлыя тоны натуральнымі фарбавальнікамі.

19 мая, панядзелак. Рэкамендуецца фарбаваць карані валасоў, а ад стрыжкі лепш устрымацца.

20 мая, аўторак. Пасля стрыжкі сёння валасы хутка растуць, але іх структура і стан не змяняецца.

21 мая, серада. Вельмі неспрыяльны дзень для ўсіх працэдур з валасамі.

22 мая, чацвер. Падыходзіць для афарбоўвання, стрыжкі і аздараўлення валасоў. Фарбавацца дазваляецца ў любыя колеры, а ўмацавальныя працэдуры зробяць валасы больш здаровымі і паслухмянымі.

23 мая, пятніца. Няўдалы для стрыжкі дзень. Валасы будуць секчыся, а прычоска хутка страціць выгляд. Фарбаваць валасы лепш у натуральныя колеры, натуральнымі сродкамі.

24 мая, субота. Стрыжка можа прывесці да абвастрэння хранічных хвароб, дазваляецца падфарбоўваць валасы адценневымі шампунямі ці мусамі.

25 мая, нядзеля. Дзень падыходзіць для самых адважных эксперыментаў з валасамі.

26 мая, панядзелак. Выдатны дзень для стрыжкі валасоў і змены іміджу, можна нават паспрабаваць радыкальную змену колеру.

27 мая, аўторак. Стрыжка дадасць вам прывабнасці, а валасам сілы, але запланаванае афарбоўванне лепш адмяніць.

28 мая, серада. Вельмі негатыўны дзень для стрыжкі і афарбоўкі валасоў.

29 мая, чацвер. Дзень няўдалы для стрыжкі, фарбаваць валасы пажадана адценневымі сродкамі.

30 мая, пятніца. Нейтральны дзень для стрыжкі і афарбоўвання валасоў.

31 мая, субота. Пасля стрыжкі ў гэты дзень прычоска зусім не трымае форму, валасы становяцца непаслухмянымі, не падаюцца ўкладцы.

■ Хто лепшы?

ПЕРШЫ ХЛОПЕЦ… У КРАІНЕ

Пераможца конкурсу «Містар Беларусь» паедзе ў сафары-тур па Кеніі, а «Містар глядацкіх сімпатый» апране даспехі рыцара ў Мірскім замку.

Калі жаночыя конкурсы прыгажосці — з'ява звыклая, нават, можна сказаць, звычайная («Міс свету», напрыклад, выбіраюць ажно з 1888 года), то абмеркаванне шырокай публікай мужчынскіх вартасцяў адбываецца значна радзей. Па-першае, тут няма агульнапрынятых крытэрыяў ацэнкі, а эталон прыгажосці з часоў Апалона Бельведэрскага яшчэ як змяніўся! Па-другое, многія, і найперш самі мужчыны, перакананы, што не мужчынская гэта справа — па подыуме дэфіліраваць… Многія, але далёка не ўсе. Магчыма, таму першы нацыянальны конкурс прыгажосці «Містар Беларусь» выклікаў такі ажыятаж.

Амаль тысяча маладых людзей ва ўзросце ад 18 да 30 гадоў палічылі сябе вартымі прэтэндэнтамі на тытул найпрыгажэйшага беларуса. Строгае журы, аднак, палічыла інакш, і ў фінал прапусціла толькі 15 удзельнікаў. Затое на любы густ — брунетаў і блан-

дзінаў, гараджан і вяскоўцаў, халастых і жанатых (так-так, для «містараў» няма абмежавання наконт штампа ў пашпарце)… Сярод фіналістаў ёсць студэнт, пажарны, журналіст, будаўнік, трэнер па фітнесе і нават хірург!

Зрэшты, выбар суддзяў віталі не ўсе, што было відаць па нязначнай актыўнасці гледачоў, якія прыйшлі на шоу ў Палац спорту. «З каго выбіраць? — здзіўляліся за нашымі спінамі дзве сярэдніх гадоў жанчыны пасля першага выхаду ўдзельнікаў. — Гэта ж зусім дзеці. Цікава, хоць адзін з іх у арміі служыў? І чаму такіх маладых выбралі? Ніводнаму трыццаці гадоў няма. Хіба пасля 30 мужчыны знікаюць? Скажыце гэта Антоніа Бандэрасу!» І хоць у некаторых кандыдатаў у «містары» ўжо ёсць уласныя дзеці, на Бандэраса ніхто сапраўды не цягнуў — хіба што на куміра маладых дзяўчат Роберта Патынсана. Але

Амаль тысяча маладых людзей ва ўзросце ад 18 да 30 гадоў палічылі сябе вартымі прэтэндэнтамі на тытул найпрыгажэйшага беларуса. Строгае журы, аднак, палічыла інакш, і ў фінал прапусціла толькі 15 удзельнікаў.

скептыцызму ў крытычна настроеных гледачоў паменшылася падчас дэфіле хлопцаў у джынсах і з аголенымі торсамі. Вядома, «гор мышцаў» тут не назіралася, але шырокія плечы, падцягнутыя постаці і «кубікі» прэса прысутнічалі.

Добрая фізічная форма ўдзельнікаў уразіла не толькі гледачоў, але і гасцей шоу — абноўленае дзявочае трыа «ВІА Гра» не шкадавала кампліментаў у адрас беларусаў. «Столькі прыгожых мужчын, і ўсіх хочацца пацалаваць!» — экзальтавана прызналася Эрыка Герцэг. Але і сваю задачу — «завесці» публіку яшчэ больш — салісткі трыа выканалі на сто працэнтаў. Зала не проста разварушылася: многія танцавалі так самаддана, быццам толькі паслухаць гурт і прыйшлі. Зрэшты, магчыма, так яно і было: калі яшчэ ўдасца за 60 тысяч рублёў (столькі каштавалі самыя танныя білеты на конкурс) трапіць на міні-канцэрт «ВІА Гра»?

Скептыцызму ў крытычна настроеных гледачоў паменшылася падчас дэфіле хлопцаў у джынсах і з аголенымі торсамі.

Хлопцы ж пасля такой гарачай падтрымкі, здаецца, пачалі рухацца яшчэ больш імкліва, энергічна і, разам з тым, элегантна, як героі галівудскіх фільмаў. Прынамсі, падчас апошняга выхаду ў вячэрніх касцюмах большасці амаль удалося пераканаўча сыграць містара Бонда і яго калег. Шкада толькі, што ў пагоні за брутальнасцю і мужным вобразам многія забыліся, што найлепшая зброя сакрэтнага агента — усмешка…

Шасцёра фіналістаў былі адзначаны спецыяльнымі прызамі — «Містар Фота», «Містар Фітнес», «Містар Стыль», «Містар Спорт», «Містар Мужчынская Салідарнасць» і «Містар глядацкіх сімпатый» (апошні, дарэчы, у якасці ўзнагароды правядзе рамантычныя выхадныя ў Мірскім замку і зможа прымерыць рыцарскія даспехі). І толькі трое, паводле рашэння журы, працягнуць барацьбу за галоўны тытул. Але нас, прызнацца шчыра, больш за ўсё цікавіла, як і чым будуць узнагароджваць пераможцу, — не каронай жа, як дзяўчат? Сімвалічнай статуэткай? Стыльным каштоўным гадзіннікам? «Гэта сакрэт», — усміхаліся прадзюсары шоу. Калі вам таксама цікава, што атрымае «Містар Беларусь» у дадатак да галоўнага прыза — сафары на паветраным шары па Кеніі, каму дастануцца тытулы віцэ-місаэраў і грашовыя прызы, варта глядзець тэлеверсію шоу, якую тэлеканал АНТ пакажа ўвечары 11 мая. Менавіта падчас тэлетрансляцыі адбудзецца глядацкае галасаванне і выбар пераможцы, на які можаце паўплываць і вы.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК. Фота Надзеі БУЖАН

СОАО «Минский завод автомобильной комплектации»
ОБЪЯВЛЯЕТ ТЕНДЕР
на техническое обследование строительных конструкций административного здания цеха, инв. № 500/С-25445
по адресу: г. Минск, ул. Лынькова, 123.

Предложения принимаются в течение 5 дней со дня публикации по адресу: **г. Минск, ул. Лынькова, 123, тел./факс 205-86-00, тел. 205-85-24.**
Тельтевский В.Н.
УНП 190050257

Технический администратор доменной зоны BY УП «НАДЕЖНЫЕ ПРОГРАММЫ» сообщает о проведении благотворительного аукциона на регистрацию доменных имен, исключенных из реестра.

Средства от аукциона, кроме стандартной стоимости услуг по регистрации доменного имени и налогов, будут перечислены на нужды детей-сирот и детей, оставшихся без попечения родителей.

Предметом аукциона являются доменные имена в доменной зоне BY, исключенные из реестра национальной доменной зоны. Перечень доменных имен, предлагаемых к регистрации по результатам аукциона, размещен на сайте https://auction.cctld.by

Дата начала аукциона – 9 июня 2014 г., дата окончания аукциона – 19 июня 2014 г.

Время начала аукциона – 12.00 даты начала аукциона, время окончания аукциона – 12.00 даты окончания аукциона. В случае, если в течение последних 2 минут до окончания аукциона была сделана ставка, срок проведения аукциона автоматически продлевается еще на 5 минут.

Аукцион проводится на интернет-ресурсе http://auction.cctld.by

В отношении каждого доменного имени, являющегося предметом аукциона, размещается программная форма, позволяющая участникам аукциона делать ставки.

Участниками аукциона могут быть юридические и физические лица, в том числе индивидуальные предприниматели, являющиеся резидентами или нерезидентами Республики Беларусь. Для участия в аукционе участник должен пройти регистрацию на сайте http://auction.cctld.by

Начальная цена предмета аукциона составляет 300 000 белорусских рублей. Шаг аукциона – 50 000 белорусских рублей.

Прием ставок прекращается по истечении 10 календарных дней после начала аукциона по каждому доменному имени.

Аукцион считается состоявшимся при наличии хотя бы одной ставки.

Победившим в аукционе считается тот участник, который сделал максимальную ставку к моменту окончания аукциона.

Текст Положения о порядке проведения аукциона на регистрацию доменных имен, исключенных из реестра, находится на сайте http://auction.cctld.by в разделе «Правила проведения аукционов».

Организатор аукциона: УП «НАДЕЖНЫЕ ПРОГРАММЫ», УНП 100160363, e-mail: au@hoster.by
Тел. организатора +375 17 239 57 02.
Тел. комиссии по организации и проведению аукциона +375 17 239 57 77.

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

Наименование	Характеристика
ЛОТ 1	
Наименование объекта, краткая характеристика	- Капитальное строение, инв. № 400/С-63418 (назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель), (принадлежность: рампа), общ. площадью – 76,1 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121. - Капитальное строение, инв. № 400/С-62629 (назначение – здание неустановленного назначения, наименование – здание охраны), общ. площадью – 3,6 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121. - Капитальное строение, инв. № 400/С-69031 (назначение – здание специализированное обрабатывающей промышленности), (принадлежность: подвал, пристройка, крыльцо), общ. площадью – 788,1 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121. - Капитальное строение, инв. № 400/С-63417 (назначение – для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель), (принадлежность: подвал), общ. площадью – 51,7 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121. - Капитальное строение, инв. № 400/С-86071 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочная тепловая сеть), протяженностью – 13,4 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121. - Капитальное строение, инв. № 400/С-86074 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочная фекальная канализация), протяженностью – 70,0 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121. - Капитальное строение, инв. № 400/С-86069 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочная ливневая канализация), протяженностью – 48,0 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121. - Капитальное строение, инв. № 400/С-86076 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – благоустройство территории), площадь покрытия – 4010 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121.
Местонахождение объекта	г. Гродно, ул. Максима Горького, 121
Лот расположен на земельном участке	Кадастровый номер 440100000002007624, площадью 0,5658 га (назначение – земельный участок для обслуживания зданий деревообрабатывающей мастерской, сушилки, пилорамы, здания охраны) по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 121
Начальная цена продажи	1 811 491 903 (один миллиард восемьсот одиннадцать миллионов четыреста девяносто одна тысяча девятьсот три) белорусских рубля без учета НДС
Сумма задатка	90 574 595 (девяносто миллионов пятьсот семьдесят четыре тысячи пятьсот девяносто пять) белорусских рублей
Продавец	Ликвидационная комиссия РУПП «Гроднотекстиль», 230015, г. Гродно, ул. Горького, 121, тел./факс 43-99-64
Организатор торгов	Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 41-98-32, 41-98-34
Условия аукциона	Без условий
Условия оплаты	По договоренности сторон
Срок заключения договора купли-продажи	Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов
Номер р/с для перечисления задатка	р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225.

Аукцион состоится 15 мая 2014 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

индивидуальным предпринимателем – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Извещение о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 14.02.2014 г.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30.

Последний день приема заявлений – 12 мая 2014 г. до 15.00.

Телефон для справок: 41-98-32, 41-98-34 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки».

■ Справа мінулых дзён

НЯБЁСЫ ЗАГАДАЛІ ВЫЖЫЦЬ!

АМАЛЬ ДЭТЭКТЫЎНАЯ ГІСТОРЫЯ ВА ЎСПАМІНАХ БЫЛЫХ ЛІТОЎСКАГА І БЕЛАРУСКАГА ПРАВААХОЎНІКАЎ

Калі пасля вялікага прамысловага горада прыязджаеш у курортны Друскінінкай, то адразу адчуваеш розніцу ў рытме жыцця. Транспартныя патокі невялікія, ды і ў пешаходных зонах ніхто нікуды не спяшаецца — усё спакойна, павольна. Так было ў савецкі час, так ёсць і цяпер. Нават не верыцца, што менавіта тут, калі «на слыху» яшчэ не было арганізаваных злачынны груповак, адбылася зусім не тэатральная, а рэальная драма.

…Разам з **гродзенцам Сяргеем Калядой** (у 1988 годзе — капітан міліцыі, дзяржаўтаінспектар Гродзенскага РАУС) пад'язджаем да аднаго з дамоў на вуліцы прыватнай забудовы ў Друскінінкаі. Каля агароджы нас сустракае **Вацлаў Бекша,** які ў 1988 годзе быў начальнікам мясцовай ДАІ, таксама ў капітанскім званні. У адрозненне ад пераважнай часткі сваіх маладых землякоў, ён добра гаворыць па-руску.

УСЁ БЫЛО СПАКОЙНА…

— 16 лютага 1988 года мы дзяжурылі ў горадзе разам з лейтэнантам Віктарам Вярбіцкім, які жыў у Беларусі (вёска Парэчча), а служыў у пазаведамаснай ахове ў Друскінінкаі — мяжа ж тады ўмоўная была. Вельмі халодная выдалася зіма, больш за мінус 20,— расказвае Вацлаў.— Гадзіна ночы, сядзім у нядаўна атрыманых службовых «Жыгулях» з узмоцненым рухавіком (2 тысячы кіламетраў прабегу) на галоўным скрыжаванні Друскінінкая і чакаем заканчэння змены. Ціха навокал, ніводнай машыны. Аўтамабіляў тады ўвогуле было мала, а ў той дзень (Дзень незалежнасці Літвы — 16 лютага — у савецкі час быў забаронены) асабліва, бо ўсе ведалі, што сітуацыю кантралююць КДБ і міліцыя, і стараліся не трапляць ім на вочы. Ды і ўвогуле спакойна было ў Друскінінкаі, практычна ніякіх здарэнняў. Я на тое дзяжурства нават не ўзяў сваю табельную зброю. Віктар Вярбіцкі кажа: «Вацлаў Іонавіч, не бярыце пісталет: у мяне ёсць. А вам навошта потым здаваць зброю пасля змены?» Я так і зрабіў.

…І РАПТАМ

— Асфальт сухі, без снегу, і добра чуваць, як на вялікай хуткасці імчыць машына на шыпаваных колах. Я кажу: «Віктар, спыні яе, праверым». «Жыгулі»- двойка з калінінградскімі нумарамі празджае скрыжаванне, але спыняецца і вяртаецца заднім ходам да нас. Віктар праверыў дакументы, папрасіў адчыніць багажнік і кліча мяне. У багажніку — поўна авечых шкур, прычым з заводскім штампам, і два мяхі з грэцкімі арэхамі. Адкуль гэта? Кажу Віктару, каб забраў ключы ад машыны. Ён паспрабаваў дастаць іх праз адчыненае вадзіцельскае акно, і раптам з салона пачалі страляць. Вярбіцкі ўпаў. А што мне, няўзброенаму, рабіць? У машыне, як я ўжо потым даведаўся, было чацвёра маладых людзей ва ўзросце прыкладна ад 25 да 30 гадоў. Адзін на мяне напаў, я адштурхнуў яго і паспрабаваў уцячы, але атрымаў кулю з аўтамата ў нагу…

Мяне пасадзілі на задняе сядзенне маёй службовай машыны і павезлі ў лес, кіламетры за два ад Друскінінкая. Прыехалі, спыніліся, адчынілі дзверцы. Я думаў, што мяне паставяць да дрэва і застрэляць. Як цяпер памятаю, нічога не гаварыў, бо была надзея, што не заб'юць. А каб заставаўся такі шанц, нельга крычаць. Быццам дзікаму зверу, які, падстрэлены, ніколі не будзе выдаваць гукаў (Ведаў пра гэта, бо сам паляўнічы.)

Але мяне да дрэва не паставілі. Там жа, у машыне, я атрымаў, як потым высветлілася, восем куль (адна прайшла літаральна за некалькі міліметраў ад сэрца), а на пярэдняе сядзенне бандыты кінулі тратылавыя шашкі — каб замесці сляды, узарваць мяне і цела Віктара Вярбіцкага, якое было ў багажніку. Тратыл доўга не ўзрываўся, а потым раптам выбух — і я страціў прытомнасць…

Але, мусіць, «нябёсы» загадалі Вацлаву Бекшу выжыць…

ІСЦІ І НЕ ПАДАЦЬ!

— Прачнуўся ад болю, выпаўз, акрываўлены, з таго, што засталося ад машыны, і стаў тушыць на сабе агонь, качаючыся па снезе. Падняўся і пайшоў. Але не ў бок дарогі, а ў лес. Метраў 200 пераадолеў — спыніўся, бо сілы скончыліся. А потым вырашыў вярнуцца да машыны. Бо калі калегі з міліцыі будуць мяне шукаць, то ў лесе не знойдуць. Вярнуўся на папялішча — нікога няма, ніхто не шукае. Неяк пракульгаў кіламетры два ў напрамку моста да аднаго з дамоў — дзвярэй не бачыў, а толькі святло ў ім. Разбіў акно. На той момант я быў у адной кашулі, якая не згарэла, ды ў ботах, а штаны нагадвалі шорты. Яшчэ не згарэла «даішная» куртка, але мне, нягледзячы на 20-градусны мароз, было горача ад атрыманых апёкаў, і я яе скінуў, кіцель — таксама… На шчасце, гаспадар пусціў мяне ў дом. Зайшоўшы, я адразу ўпаў на ложак, засланы белым пакрывалам, і адключыўся. На сваёй машыне Сігідас павёз мяне ў бальніцу.

Ужо падчас следства высветлілася, што Вацлаў Бекша, не загрэўшы пасля выбуху тратылавых шашак, мог... зноў трапіць у рукі ўзброенай банды. Бо калі ён пайшоў у лес, то бандыты, ад'ехаўшы кіламетраў 10 ад Друскінінкая, вярнуліся на месца злачынства. Яны ўспомнілі пра дакументы на сваю машыну і правы кіроўцы, якія ў самым пачатку забраў Віктар Вярбіцкі. Аднак калі вярнуліся, то ўбачылі толькі касцёр ды фрагменты ўзарванага аўтамабіля на снезе, якія былі раскіданы на дзясяткі метраў.

Дарэчы, машына Сігідаса, на якой Вацлаў быў дастаўлены ў бальніцу, магла таксама трапіць пад стрэлы. На скрыжаванні іншы экіпаж ДАІ ўбачыў кроў, таму ўсе мясцовыя праваахоўнікі былі падняты па трывозе, сталі шукаць Вярбіцкага і Бекшу. А тут — аўтамабіль без святла ў адной фары, кіроўца якога не рэагуе на патрабаванне спыніцца. Спыніўся Сігідас каля бальніцы…

Толькі на твары Вацлаву зрабілі тры аперацыі — увогуле ж іх было больш за дзясятак. Асабліва складаныя выканалі вільнюскія мікрахірургі.

— А спачатку, калі мяне, нетраспартабельнага, аперыравалі ў Друскінінкаі, ніхто і не думаў, што выжыву. Бацькам казалі, што трэба рыхтавацца да самага горшага,— прыгадвае Вацлаў Бекша.

БАНДЫТАЎ ВЫДАЛІ… АРЭХІ

Але ён выжыў! І больш за тое, менавіта сведчанні Вацлава дапамаглі пакараць злачынцаў. Праўда, спачатку яму не верылі, што бандыты былі на машыне з калінінградскай «прапіскай». Супрацоўнікі КДБ з Вільнюса ўпарта трымаліся за версію, што (паколькі быў Дзень незалежнасці) напад на міліцыянераў быў здзейснены літоўскімі нацыяналістамі. «Ты памыляешся, што нумары машыны калінінградскія — каўнаскія яны!» — спрабавалі пераканаць Вацлава Бекшу. Але ён сваіх паказанняў не мяняў. І неўзабаве яны (пра «Жыгулі» сіняга колеру, літары і першыя лічбы нумара, авечыя шкуры і грэцкія арэхі ў багажніку) пацвердзіліся. Менавіта ў Калінінградзе. Выдалі бандытаў… арэхі. Адчуўшы «дыханне» праваахоўнікаў, яны пачалі разбіраць у гаражы машыну на запчасткі і пры гэтым елі арэхі, кідаючы шкарлупіну на падлогу. На гэта і звярнуў увагу ўчастковы міліцыянер, але выгляду, што нечым зацікавіўся, не падаў…

Праўда, злачынцы ўсё ж адчулі небяспеку і пахаваліся, але іх адрасы былі ўжо вядомы аператыўнай групе МУС Літвы, якая прыбыла ў Калінінград. Аднаго бандыта бралі ў прыватным доме, дзе быў цэлы склад зброі, і застрэлілі пры спробе супраціўлення. Другі ўзяў заложніцу ў шматпавярховцы, але быў застрэлены снайперам. А яшчэ дваіх членаў злачыннай групоўкі ўзялі жывымі. Суд над імі доўжыўся год. Вацлава Бекшу некалькі разоў вазілі ў Калінінград пад узброенай аховай з чатырох чалавек, ахоўвалі і там падчас пражывання ў вайсковай казарме і знаходжання ў судзе. Увогуле, як яму помніцца, банду судзілі за 28 злачынстваў (крадзяжы, узброеныя напады, катаванні ахвяр, згвалтаванні) у розных рэгіёнах СССР. У іх узялі наяўнымі каласальную на той час суму — 3 мільёны рублёў.

«УСЁ НЕ ТАК І КЕПСКА»

…Вацлаў Бекша лячыўся 8 месяцаў, пасля чаго вярнуўся на сваю пасаду галоўнага даішнка Друскінінкая. Зноў далі новую службовую машыну і, безумоўна, форменае адзенне. Указам першага і апошняга Прэзідэнта СССР Міхаіла Гарбачова яго ўзнагародзілі ордэнам Чырвонага Сцяга, які Вацлаву ўручыў міністр унутраных спраў Літвы. Верагодна, гэта была апошняя савецкая ўзнагарода літоўскаму праваахоўніку. Такім жа ордэнам (пасмяротна) быў узнагароджаны і беларус Віктар Вярбіцкі, якога пахавалі ў Парэччы. На пенсію Вацлаў Бекша выйшаў камісарам мясцовай паліцыі (у нас гэта намеснік начальніка РАУС). Цяпер пагоны афіцэра паліцыі носіць яго сын.

Сяргей КАЛЯДА і Вацлаў БЕКША.

Палітыкі могуць разыходзіцца ў поглядах, але галоўнае, каб былі нармальныя адносіны паміж звычайнымі людзьмі.

На месцы, дзе бандыты яго расстрэльвалі і палілі, Вацлаў Бекша быў толькі аднойчы пасля выхаду з бальніцы і падчас следства, а больш па той дарозе не ездзіць. І грыбы ў тым лясным масіве не збірае. Але ён, хоць і немагчыма выкрасліць з памяці тую трагедыю, ужо навучыўся жыць звычайным, паўсядзённым жыццём, быццам асобна ад трагічных успамінаў. Нават некаторыя ўласныя ўчынкі падчас тых крывавых падзей ацэньвае не без самаіроніі.

— Не хачу, каб мяне шкадавалі. Усе добра, кажу, калі пытаюцца пра здароўе. Лепш мне ўжо не будзе, але ўсё не так і кепска. Бачыце, як доўга жыву пасля таго, што здарылася…

ПА-ЛЮДСКУ

Вацлаў Бекша і сёння ўдзячны незнаёмым людзям з неабсяжнай прасторы ўжо неіснуючай краіны, якіх усхвалявала публікацыя ў часопісе «Советская милиция» пра яго неверагоднае выратаванне:

— Колькі я лістоў атрымаў з добрымі словамі і найлепшымі пажаданнямі з розных куткоў Савецкага Саюза! Нават з Сібіры. Лекі прысылалі, у Карпаты запрашалі на адпачынак. Палітыкі могуць разыходзіцца ў поглядах, але галоўнае, каб былі нармальныя адносіны паміж звычайнымі людзьмі. Напрыклад, у многіх жыхароў Друскінінкая па сёння, яшчэ з савецкіх часоў засталіся сяброўскія сувязі з расіянамі, якія калісьці ўпадабалі наш курорт. А мы, праваахоўнікі, цесна супрацоўнічалі з беларускімі калегамі, мелі добрых знаёмых у Гродне: крыміналісты — сваіх, даішнікі — сваіх. Нават калі ўжо няма службовых спраў, то некаторыя працягваюць сябраваць, як мы з Сяргеем Калядой.

…16 лютага 1988 года, у той самы дзень, дзяржаўтаінспектар Гродзенскага РАУС Сяргей Каляда разам з яшчэ адным супрацоўнікам атрымалі загад заступіць на дзяжурства на трасе каля вёскі Парэчча.

— Прыйшло паведамленне, што ў Ваўкавыскім раёне абрабаваны хутар. Гаспадары засталіся жывымі, але злачынцы могуць быць узброеныя. Тады гаварылася пра калінінградскія нумары «Жыгулёў», а таксама пра авечыя шкуры і грэцкія арэхі, што знаходзіліся ў машыне. Але бандытам удалося ўцячы ў Друскінінкай, дзе на іх шляху паўсталі Вацлаў Бекша і Віктар Вярбіцкі. Дарэчы, як і ў іх, у нас з напарнікам таксама быў адзін пісталет на дваіх. Бо тады не верылася, што магчыма сустрэча з узброенай групоўкай: такога яшчэ не здаралася ні ў Літве, ні ў Беларусі. Гэта быў першы выпадак, калі стала зразумела, што час змяніўся, пайшоў іншы адлік… Потым, калі Вацлаў у асноўным прайшоў лячэнне, яго запрасілі ў Гродна выступіць перад нашымі супрацоўнікамі ДАІ. Мы ўсе глядзелі на яго як на легендарнага калегу, які не толькі неверагодным чынам выжыў, але і не дазволіў злачынцам пазбегнуць пакарання. Аднак для мяне ён, перш за ўсё, добры чалавек. Таму мы ўжо столькі гадоў і сябруем.

…Вацлаў Бекша і Сяргей Каляда абдымаюцца на развітанне, абменьваюцца падарункамі — да новых сустрэч! Мяжа сябрам не перашкодзіць…

Барыс ПРАКОПЧЫК.
Фота аўтара.
Гродна — Друскінінкай.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ 04 июня 2014 года в 11.00 ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ

АВТОМОБИЛЕЙ

Организатор аукциона: РУП «Белсоюзпечать»
Место проведения аукциона: г. Минск, ул. Володарского, 16, к. 400.
Контактные телефоны: 8-017-327-46-94, 8017-289-13-24.

ЛОТ № 1. Наименование предмета аукциона:
Автомобиль ГАЗ-3302, 2005 года выпуска, инвентарный номер 504017.
Начальная цена предмета аукциона 7 488 115 рублей.
Размер задатка для участия в аукционе: 1 200 000 рублей.
ЛОТ № 2. Наименование предмета аукциона:
Автомобиль ГАЗ-3302, 2005 года выпуска, инвентарный номер 504019.
Начальная цена предмета аукциона 8 718 368 рублей.
Размер задатка для участия в аукционе: 1 500 000 рублей.
ЛОТ № 3. Наименование предмета аукциона:
Автомобиль ГАЗ-33021, 2005 года выпуска, инвентарный номер 504020.
Начальная цена предмета аукциона 8 718 368 рублей.
Размер задатка для участия в аукционе: 1 500 000 рублей.

Продавец имущества: **РУП «Белсоюзпечать» г. Минск, ул. Володарского, 16, к. 203. Контактные телефоны: 8017-327-46-94, 8017-289-13-24.**
Место нахождения предмета аукциона: **г. Минск, ул. Лукьяновича, 12.**
Расчетный счет для внесения суммы задатка: Назначение платежа – Задаток для участия в аукционе (без НДС). Расчетный счет № 3012102694011 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» по г. Минску, г. Минск, код 369, пр-т Машерова, 80. УНП 100071552, ОКПО 14795291.
Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе: **г. Минск, ул. Володарского,16, кабинет 401, ежедневно в рабочие дни с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 16.30, по 03 июня 2014 г. до 10.00.**

К заявлению прилагаются следующие документы:
документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка;
юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;
иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;
иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;
представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель);
представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность;
представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.
При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).
В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене продажи, увеличенной на 5%.
Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них. В случае письменного отзыва данного заявления либо неявки участника торгов на торги сумма внесенного им задатка возвращается организатором торгов в течение 5 рабочих дней со дня их проведения.
ПОБЕДИТЕЛЬ ОБЯЗАН: Подписать протокол о результатах аукциона. В течение 3 рабочих дней возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением, предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения. После совершения победителем аукциона названных действий не позднее 7 календарных дней от даты подписания протокола о результатах аукциона в установленном порядке заключить с продавцом договор купли-продажи имущества. В случае отказа или уклонения единственного участника торгов от возмещения затрат на организацию и проведение торгов, заключения договора купли-продажи предмета торгов внесенный им задаток возврату не подлежит.
Аукцион проводится в порядке, установленном Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь № 609 от 12.07.2013 года.

Утерянный страховой полис обязательного страхования гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории РБ серии ВР № 5058057 СООО «Белкоопстрах» **считать недействительным.** УНП 100706519

В **суд Речицкого района Гомельской области** поступило заявление об объявлении умершим АСТАПЕНКО Федора Викторовича, 24 июля 1953 года рождения, проживавшего по последнему известному адресу: Гомельская область, г. Василевичи, ул. Чехова 364 км, дом 4 «А», квартира 3.
Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам сообщить в суд Речицкого района в течение 2-х месяцев со дня публикации имеющиеся сведения об Астапенко Федоре Викторовиче.

ООО «Юридическая группа «СОВЕТНИК» – управляющий по делу о банкротстве ИП «МИРАЛЕКС», ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 19.04.2014 в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Сурганова, д. 43, пом. 20, ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ в форме аукциона по продаже имущества должника:
- ✓ автозаправочная станция по цене 30 000 000 руб.;
- ✓ объекты недвижимости и имущество нефтебазы по цене 181 200 000 руб.;
- ✓ насос АСЦЛ-20-24Г (3 шт.) по цене 35 953 470 руб.;
- ✓ стояк загрузочный по цене 30 276 990 руб.;
- ✓ стояк сливной по цене 30 276 990 руб.

Заявки на участие в вышеуказанных торгах принимаются **до 16.05.2014 г.**
С информацией о порядке, условиях проведения повторных торгов, предметах торгов можно ознакомиться на сайте **www.sov.by**, а также по тел.: **+37529 177 55 11.**
УНП 190816859

Ветракоў усё больш

Станоўчы вопыт першага ветрака магутнасцю 1,5 МВт, які «Гроднаэнерга» ўвяло ў эксплуатацыю тры гады таму каля вёскі Грабнікі Навагрудскага раёна, усё больш актыўна распаўсюджваецца на тэрыторыі вобласці.

Акрамя Навагрудчыны, дзе плануецца ўстаноўка яшчэ шасці ветраўстановак магутнасцю 1,5-2 МВт, у гэтым кірунку працуюць у Смаргонскім, Ашмянскім і Дзятлаўскім раёнах. У прыватнасці, дзве ветраэнергетычныя ўстаноўкі (кожная — магутнасцю 600 кВт, вышынёй каля 58 метраў) нядаўна змантіраваны, прайшлі выпрабаванні і ўжо выпрацоўваюць электраэнергію на Смаргоншчыне непадалёк ад аграгарадка Крэва. Сёлета на крэўскім узвышшы плануецца мантаж яшчэ чатырох ветраагрэгатаў.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

ОАО «Белпромтара»
уведомляет о проведении очередного общего собрания акционеров 28 мая 2014 г. в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 22.

ПОВЕСТКА ДНЯ:
1. Об итогах работы финансово-хозяйственной деятельности Общества за 1 квартал 2014 г.
2. Об утверждении бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках за 1 квартал 2014 г.
3. Утверждение порядка распределения прибыли, остающейся в распоряжении Общества за 1 квартал 2014 г.
УНП 100230455

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

по объекту «12-этажный жилой дом со встроенными помещениями № 31 (по генплану) в микрорайоне Малиновка-6. Встроенные помещения»

Застройщик – коммунальное унитарное дочернее предприятие «Управление капитального строительства Московского района г. Минска» зарегистрировано Мингорисполкомом 12.02.2014 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190579681.
Юридический адрес: 220004, г. Минск, ул. Короля, 20, тел/факс 200-01-98. Режим работы: понедельник – четверг с 8.30 до 17.30, пятница с 8.30 до 16.15. Обеденный перерыв с 13.00 до 13.45.
Выполняя функции заказчика, в течение последних трех лет государственное предприятие «УКС Московского района г. Минска» построены и введены в эксплуатацию объекты:
- жилые дома № 32, 36/1 по ул. Я.Чечота;
- жилые дома № 6, 8, 10, 12 по ул. Некрашевича;
- жилые дома № 6, 8, 10, 14 по ул. Каролинской;
- жилой дом № 4 по ул. С.Есенина.

Цель проекта – строительство 7 квартир общей площадью 383,68 кв.м на первом этаже жилого дома № 31 со встроенными помещениями (по генплану) в микрорайоне «Малиновка-6» в г. Минске.
Строительство осуществляется за счет средств физических и юридических лиц.
Начало основного периода строительства объекта – январь 2012 года. Окончание строительства – 31 мая 2014 года.
Проектно-сметная документация прошла в установленном порядке государственную экспертизу, получено положительное заключение РУП «Главгосстройэкспертиза» от 12.11.2007 № 2478-5/07, от 27.09.2011 № 732-15/11, от 30.11.2011 № 983-15/11.
Участок площадью 0,2345 га передан государственному предприятию «УКС Московского района г. Минска» решением Мингорисполкома от 12.09.2013 № 2314. Свидетельство о государственной регистрации земельного участка от 22.10.2013 № 500/1032-8354.
Получено разрешение Госстройнадзора от 05.03.2014 № 2-203Ж-004/12.
Генеральный подрядчик – ООО «Бифрест».
Жилой дом запроектирован 12-этажным 2-секционным, всего квартир – 117, в том числе однокомнатных – 48 шт., двухкомнатных – 24 шт., трехкомнатных – 44 шт., четырехкомнатных – 1 шт.
Конструкция здания – монолитный каркас со стенами из ячеистобетонных блоков. Квартиры имеют остекленные балконы и лоджии.
В состав общего имущества объекта входят лестницы, лестничные клетки, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, кровля, технические и подвальные этажи, другие места общего пользования, ограждающие несущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование общедомового назначения, находящееся за пределами или внутри жилых помещений.
Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства для юридических лиц и граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, предлагается:
- 1 (одна) однокомнатная квартира общей площадью 46,48 кв.м на 1-ом этаже жилого дома стоимостью за 1 (один) кв.м общей площади в размере, эквивалентном **1 500 долларов США** по курсу, установленному Национальным банком Республики Беларусь на день оплаты.

Условия оплаты – единовременная оплата в течение **30 (тридцати) календарных дней** со дня регистрации договора в Мингорисполкоме.
Стоимость 1 кв.м общей площади фиксируется в долларовом США эквиваленте и остается неизменной в долларовом США эквиваленте до окончания действия договора. Стоимость 1 кв.м общей площади квартир указана без учета выполнения внутренних отделочных работ.
Оплата производится в белорусских рублях по курсу НБ РБ на день оплаты.
Для заключения договоров необходимы:
- паспорт и личное присутствие лица, с которым будет заключаться договор.

Документы для заключения договоров будут приниматься с 12.05.2014. До заключения договора создания объекта долевого строительства обязательно осуществляется предварительный осмотр объекта долевого строительства. Прием заявлений осуществляется до момента набора необходимого количества заявлений, соответствующего количеству продекларированных квартир.
Если гражданин либо иной претендент на участие в долевом строительстве в течение 5 (пяти) календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и государственное предприятие «УКС Московского района г.Минска» оставляет за собой право заключить договор на заявленную квартиру с другим претендентом.
Срок действия настоящей проектной декларации – до момента опубликования новой проектной декларации, которая отменяет действие опубликованной ранее.
Более подробные сведения об объекте долевого строитель

■ Помніць, шанаваць, ганарыцца

МАЙСКІ ВАЛЬС

Яркім феерверкам успыхнула песня «Майскі вальс» Ігара Лучанка і Міхаіла Ясеня на музычным небасхіле. Яна, як і «Дзень Перамогі» Давіда Тухманава і Уладзіміра Харытонава, арганічна ўвайшла ў рэпертуар спевакоў і харавых калектываў — і вось ужо тры дзясяткі гадоў па-святочнаму прывабна трымаецца на беларускай і рускай эстрадзе, паважліва суседнічае з многімі вакальнымі творамі, якія ўзніклі ў часы ваеннага ліхалецця і ў першыя пераможныя дні.

Паэт Міхаіл Ясень доўгі час працаваў над патрыятычным вершам, што лёг у аснову песні. Юнацкія перажыванні з франтавых дарог падказвалі рытм і танальнасць мастацкіх радкоў. Заканчэнне Вялікай Айчыннай вайны ён сустрэў у Германіі. Там і нарадзілася задума паэтычна адлюстраваць асабістае і агульнаграмадскае, бо вайна адбілася на лёсах людзей усёй планеты.

У душы паэта выкрышталізоўваўся вобраз — сімвал нязломнасці стваральнага духу. І ён увасобіўся ў МУЗЫЦЫ. Менавіта музыка вельмі вытанчана перадае ўсе пачуццёвыя перажыванні, вытлумачвае сэнс нашага існавання. А музыка, што яднае ўсе народы, у песні паўстае ў абліччы вальса. Ён паходзіць з сялянскіх парных танцаў, што шырока бытавалі на сумежнай тэрыторыі Паўднёвай Германіі, Аўстрыі, Чэхіі. У XVIII стагоддзі вальс пранік у еўрапейскія гарады, а праз 100 гадоў стаў самым папулярным танцам на кантыненце. Яго мелодыя гучыць на вясковых вечарынках і прыдворных балях, у песнях і рамансах, операх і балетах.

У новым вакальным творы на звычайнай, параненай, як і людзі, гармоніі сонечнымі гукамі вальса салдат-музыка радаваў прысутных на вуліцах Вены, якая ў XVIII—XIX стст. лічылася музычнай сталіцай Еўропы.

Своеасабліва ўспрымаецца Дунай у песні. Ён выступае сімвалам міру, дружбы і любові. Рака бярэ пачатак у паўднёвай Германіі і паўнаводнай плынню духоўна нітуе народы Аўстрыі, Славакіі, Венгрыі, Харваты, Сербіі, Балгарыі, Румыніі, Малдовы, Украіны. І рух яе плыні — як і рытм вальса: спакойна-велічны, пяшчотна-элегантны, а дзе і хуткі, імклівы.

Радасць перамогі іскрыстай хваляй прамчалася па планеце ў майскія дні — у той перыяд, калі зямля, нібы ў вэлюм, ахінаецца ў кветцень і радуецца канчатковай перамозе над зімовым сіверам. (Паэт крыўдаваў, калі ў загалоўку песні вальс называлі «венскім», бо «майскі» — шырэйшы па значэнні: ахоплівае ўсю Еўропу, над якой можа валадарыць толькі Сонца.) Музычнымі сродкамі Ігар Лучанок таленавіта раскрыў сэнс верша, яго мастацкую вобразнасць і стварыў адметны нацыянальны твор.

Першапачаткова песня «Майскі вальс» узнікла на рускай мове. У ансамблі «Сябры» яна загучала па-беларуску (пераклад тэксту зрабіў паэт Іосіф Скурко). Міхаіл Ясень вырашыў сам перакласці верш. Яго беларускамоўны варыянт сэнсава паглыбіўся: вобраз салдата-музыкі набыў больш абагульненыя рысы, яго мелодыя вальса адлюстроўвае радасць і боль свайго народа, яна прачула блізкая і родная ўсім. Таму вакальны твор «Майскі вальс» выглядае своеасабліва сімвалам. Ён пераканальна сцвярджае: толькі духоўна-інтэлектуальныя дзеі радасна пашыраюцца, актыўна супрацьстаяць агрэсіі і перамагаюць.

Падрыхтаваў Міхась ШАВЫРКІН.



параненай дужа гармоні
Вальс родны
іграў наш салдат.

Прыпеў:

Помніць Вена,
Помняць Альпы
І Дунай
Той пяшчотны
І чароўны
Ясны май!
Віхры венцаў
У тым вальсе
Скрозь гады
Помніць сэрца
І запомніць
Назаўжды!

Натхнёна, і горда, і смела
Вальс сонечны ў Вене гучаў.
І Вена смяялася, пела,
Як быццам сам Штраус іграў!
І хлопец
з усмешкай шчаслівай
Да сэрца гармонь прыціскаў,
Як быццам Радзімы
ён бачыў разлівы,
Як быццам яе абдымаў.

Прыпеў.

Над Венай сівой і бурлівай
Плыў вальс,
што прынесла вайна.
Гучаў ён пяшчотна, шчасліва.
І ўсіх ап'яняла вясна.
Вясна сорак пятага года!
Цябе дачакаўся Дунай.
Радзімы далёкай
той вальс пераможны
Салдат на гармоні іграў.

Прыпеў.

Даты Падзеі Людзі

Сусветны дзень свабоды друку. Адзначаецца па ініцыятыве Генеральнай канферэнцыі ЮНЕСКА, падтрыманай 21 снежня 1993 года Генеральнай Асамблеяй ААН. 3 мая 1991 г. у сталіцы Намібіі была падпісана Віндхукская дэкларацыя, у якой змяшчаўся заклік да ўрадаў дзяржаў усяго свету забяспечваць свабоду прэсы і яе дэмакратычны характар.

1799 год — нарадзіўся (пасёлак Мір, цяпер Карэліцкі раён) Фларыян Бохвіц, беларускі філосаф, прадстаўнік хрысціянскага кірунку філасофскай думкі. Вучыўся ў Нясвіжы, вывучаў права ва ўніверсітэтах Кіева і Вільні. Быў членам Навагрудскай карпарацыі адвакатаў. Імкнуўся прымірыць рэлігійныя ідэі з навукай. Аўтар прац «Думкі аб выхаванні чалавека», «Сутнасць маёй думкі» і іншых. Бохвіц не стварыў стройнай філасофскай сістэмы, але распрацаваў шэраг асобных пытанняў грамадска-палітычнага і этычнага характару. Разглядаў пытанні выхавання і адукацыі ў залежнасці ад розных узростаў, закранаў праблемы жаночага выхавання (лічыў, што яно павінна быць хатнім). Выступаў за спалучэнне навучання з працоўнай дзейнасцю вучняў, гарманічнае развіццё іх разумовых і фізічных здольнасцяў. Сэнс адукацыі бачыў у выхаванні людзей, карысных для грамадства «на розных пасадах і ў розных жыццёвых абставінах». Памёр у 1856 годзе.

1939 год — быў адпраўлены ў адстаўку народны камісар замежных спраў СССР Максім Максімавіч Літвінаў. На яго месца прызначылі Вячаслава Молатава, які застаўся таксама кіраўніком урада. Адносіны паміж Літвінавым і Молатавым былі напружанымі. Літвінаў лічыў Молатава абмежаваным чалавекам, інтрыганам і памагатым рэпрэсій. Молатаў, у сваю чаргу, недалюбліваў Літвінава — адзінага сталінскага наркама, які захаваў самастойнасць. Для заходніх краін рашэнне аб зняцці Літвінава стала поўнай нечаканасцю. У асяроддзі Сталіна Молатаў лічыўся прыхільнікам збліжэння з Германіяй. Таму яго прызначэнне было ўспрынята як запрашэнне Германіі да перамоў, і Гітлер неадкладна даў інструкцыі германскаму паслу Шуленбургу выявіць настроі ў Маскве. У жніўні 1939 года Германія і СССР падпісалі пакт аб ненападзенні.

1949 год — 65 гадоў таму нарадзіўся (горад Дзятлава) Уладзімір Іванавіч Пакрышкін, беларускі канструктар оптыка-электроннай тэхнікі. Скончыў Мінскі педагагічны інстытут, з 1975 года працуе ў ААТ «Пеленг», у тым ліку з 1988-га з'яўляецца начальнікам навукова-даследчага аддзялення і намеснікам генеральнага канструктара. Затым — дырэктар навукова-вытворчага цэнтра «Спецыяльныя комплексныя сістэмы», з 1998-га — яго генеральны дырэктар. Распрацоўваў оптыка-электронныя прыборы і прыцэльныя сістэмы для бранятанкавай тэхнікі. Галоўны канструктар мэтавай апаратуры для касмічнага апарата дыстанцыйнага зандзіравання зямлі (ДЗЗ). З 2003 года — адзін з асноўных распрацоўшчыкаў і выканаўцаў Беларускай касмічнай сістэмы ДЗЗ. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (2003).

НАРОДЖАНЫЯ 3 мая

Гэтыя людзі не толькі цудоўна разбіраюцца ў грамадскай псіхалогіі, але і валодаюць яскрава выяўленымі здольнасцямі лідараў і прамоўцаў. Яны надзейныя ў хвіліны выпрабаванняў, здольны даць каштоўныя і патрэбныя парады. З іх атрымліваюцца бліскучыя пасярэднікі, дарадцы, арбітры, цудоўныя сябры. Аднак ім не трэба забывацца пра неабходнасць штодзённых праяў дабрыні як у адносінах да калег па рабоце, так і у сваёй сям'і.

НАРОДЖАНЫЯ 4 мая

Асобы, якія не імкнуцца да лідарства, аддаючы перавагу рабоце ў складзе каманды. Іх адметнай рысай з'яўляецца схільнасць да рызыкоўных мерапрыемстваў. У прынцыповых пытаннях яны цвёрда адстойваюць уласны пункт гледжання і пераканаць іх у іншым практычна немагчыма. Яны вельмі шануюць свае ідэалы і не дапускаюць ніякіх кампрамісаў; пры гэтым яны людзі надзейныя і гатовыя заўсёды дапамагчы. Іх разважанні часцей за ўсё падтрымліваюцца не словамі, а ўчынкамі і асабістым прыкладам. Чуйныя і зямныя натуры, яны спакойныя і шчаслівыя, калі знаходзяцца ў хатняй абстаноўцы, якая адпавядае іх разуменню прыгажосці і гармоніі.

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

АВЕН. Давядзецца настойліва і цярпліва прасоўвацца ўгару па стромкіх усходах. Пры гэтым вам спатрэбіцца нямала часу і намаганняў, каб вырашыць мноства дробных праблем. Бліжэй да выхадных можа з'явіцца жаданне даваць карысныя парады і вучыць навакольных жыць. Калі не хочаце нарвацца на сустрэчную просьбу дапамагчы матэрыяльна ці на яшчэ менш прыемныя наступствы, то добра падумайце, ці сапраўды запатрабаваны вашы павучанні.

ЦЯЛЕЦ. На працы спатрэбяцца неверагодныя намаганні, таму лепш адразу вызначыцца, з якім аб'ёмам вы рэальна справіцеся, і ні ў якім разе не згаджацца на большае. Засяродзьцеся цяпер на самым галоўным і не захрасайце на дробных задачах. На праверку надзейнасці новых партнёраў часу і сіл лепш не шкадаваць — толькі тады ёсць сэнс пачынаць сумесную дзейнасць.

БЛІЗНЯТЫ. Тыдзень можа закінуць у самы цэнтр падзей, вы будзеце запатрабаваны паўсюль — як на працы, так і дома. Калі жыццё будзе працягваць здавацца сумным, то дайце волю авантурызму ў аўторак, тым самым абавязкова створыце сабе неспадзяваныя праблемы. З-за побытавых праблем не выключаны сваркі з блізкімі людзьмі, таму паспрабуйце правесці вольны час у адзіноце.

РАК. Паспрабуйце ў найбліжэйшыя дні не марнаваць свае сілы на загадзя невыканальныя задачы. Першую палову тыдня падрыхтуйцеся працаваць у камандзе, нават калі гэта супярэчыць планам, і не будзеце расчараваны. Варта берагчы сваю рэпутацыю і памятаць, што часам маўчанне даражэй за золата. Дапамажыце свайму розуму ўзяць верх над эмоцыямі, і вы пераканаецеся: толькі спакойная ацэнка таго, што адбываецца, прынясе поспех. Абавязкова прыслухайцеся да мудрых парад старэйшага пакалення і зрабіце адпаведныя высновы.

ЛЕЎ. Паспрабуйце не рабіць лішніх рухаў: мітусня толькі зморыць, затое спакой дапаможа шмат у чым разабрацца. Паберажыце сваё здароўе, але зусім не расслабляйцеся. Серада будзе сядзейнічаць роздумам і духоўнаму росту, таму не здзіўляйцеся думкам філасофскага характару. У адносінах з дзелавымі партнёрамі магчымыя невялікія трэнні не па вашай віне. Будзе правільным дачакацца, пакуль супакоіцца запал, і ўзяць ініцыятыву ў свае рукі.

ДЗЕВА. Планы давядзецца ў карані перагледзець. Тым не менш вы, хутчэй за ўсё, зможаце паспяхова рэалізаваць асабістыя праекты, што выкліча захапленне навакольных. З самай нязначнай праявай няўпэўненасці ва ўласных сілах варта бязлітасна змагацца. Лепш шукайце падтрымку ўсюды, дзе толькі можна, але ад дзеянняў не адмаўляйцеся. У суботу наведванне забаўляльных мерапрыемстваў для вас непажадана. Нядзеля будзе добрым днём для разбурэння непатрэбнага і старога і стварэння новага.

ШАЛІ. Тыдзень садзейнічае праявам сабранасці і настойлівасці, калі любыя магчымыя перашкоды ў справах не змогуць паўплываць на вынік. Цярпенне і мэтанакіраванасці хопіць абсалютна на ўсё. Асвойваць новыя галіны ведаў будзе таксама вельмі лёгка. Паспрабуйце вылучыць хоць бы адзін дзень для прыбірання ці для дробнага рамонту свайго жылля, і вы прыведзяце яго ў ідэальны парадак. У выхадныя асцерагайцеся вялікіх і шумных кампаній: там вас можа падсцерагаць зман і расчараванне.

СКАРПІЁН. Вас можа ахапіць неператадольнае жаданне пранікнуць у сутнасць рэчаў. Шмат чаго адкрыецца з новага пункту гледжання, але не захапляйцеся аналізам на шкоду актыўнай дзейнасці. У сераду важна не спазняцца. Праявіце пунктуальнасць і адказнасць — менавіта па іх вас будуць ацэньваць, ды, да таго ж, могуць проста не дачакацца. Не давайце навакольным нагоды выйсці з раўнавагі. Жаданне змен павінна падштурхнуць да рашучых дзеянняў у выхадныя.

СТРАЛЕЦ. Паспрабуйце больш часу праводзіць на прыродзе, абмяжуйце зносіны з гарадскімі пейзажамі да неабходнага мінімуму. У аўторак і сераду пажадана не перагружацца: гэта можа адбіцца як на выніках працы, так і на самаадчуванні. На працы пажадана ісці на кампраміс, а праяўляючы ініцыятыву, улічваць інтарэсы калег. Прыслухайцеся да парад сяброў і сваякоў, бо ім збоку відаць прамашкі, якіх вы можаце не заўважаць. У выхадныя пазбаўце сябе ад непатрэбных сустрэч і кантактаў. У гэтыя дні вам будзе карысна трохі павандраваць, задавальняючы жаданне да змены месцаў.

КАЗЯРОГ. Не спяшайцеся браць на ўзбраенне ідэі і прапановы, якія паступяць на гэтым тыдні, нават не гледзячы на ўсю іх прывабнасць, але зафіксуйце на паперы і адкладзіце да больш спрыяльнага моманту. Праверцы дзелавых папер лепш за ўсё прысвяціць аўторак. Працягвайце развіваць усе віды супрацоўніцтва і ўмацоўвайце асабістыя адносіны. У другой палове тыдня вам пагражае адзінота, якая будзе мець часовы характар. Але гэта адаб'ецца на вашым настроі і справах пазітыўным чынам.

ВАДАЛЕЙ. У панядзелак і аўторак трымайце ідэі і планы пры сабе, а пачынаючы з серады, неабходна будзе праявіць ініцыятыву ў ажыццяўленні сваіх задум. Тыдзень спрыяльны для навуковых даследаванняў. Перад вамі павінны адкрыцца новыя магчымасці, у якіх вам будзе спадарожнічаць шанцаванне. Новыя пачынанні, як і набыццё неабходных для дома рэчаў, лепш ажыццяўляць у чацвер. І не адкладвайце вырашэнне праблем, інакш могуць з'явіцца складанасці ў адносінах з сябрамі.

РЫБЫ. Дазвольце сябрам і аднадумцам прыняць актыўны ўдзел у вашых справах. Працягвайце займацца ўласнымі планамі, але не грэбуйце сям'ёй. У панядзелак не варта спакушацца прапановамі, якія паступяць: зарабіць наўрад ці атрымаецца. Публічныя выступленні лепш за ўсё запланаваць на сераду. У чацвер магчымыя пэўныя непаразуменні з начальствам з-за розных поглядаў на вырашэнне неадкладнага пытання. У выхадныя дні суцішце сваё жаданне сур'ёзна ўзяцца за выхаванне дзяцей.

ФЭСТ МЫЛЬНЫХ БУРБАЛАК У БРЭСЦКІМ ПАРКУ

сабраў шмат удзельнікаў

Арганізатары нават не думалі, што столькі людзей адгукнецца на заклік у сацыяльных сетках. Але дзень быў цёплы, да таго ж выхадны. І таму многія прыйшлі са сваімі прыстасаваннямі для пускання бурбалак. Іграла музыка, навокал прадавалі марозіва, газіроўку. Парад з бурбалкамі прайшоў па ўсім парку імя 1 Мая ў бок летняга тэатра. А там брэсцкія артысты паказалі цікавую анімацыйную праграму.

Яна СВЕТАВА.

Дарагую сястрычку **Галіну Мікалаеўну ЯРОЦКУЮ** з вёскі Падварышкі Воранаўскага раёна **віншуем з юбілеем!**

Хай сонца заўсёды свеціць і грэе,
Хай збудуцца ўсе жаданні, надзеі.
Хай смутку ніколі не ведаюць вочы,
Здароўе і шчасце няхай з табой крочаць.

Сястра і яе сям'я.

НЕСПРЫЯЛЬНЫЯ ДНІ І ГАДЗІНЫ Ў МАІ

3, субота, *3.00 — 24.00*
5, панядзелак, *0.00 — 7.30*
7, серада, *12.00 — 24.00*
8, чацвер, *0.00 — 7.30*
9, пятніца, *22.30 — 24.00*
10, субота, *0.00 — 18.30*
12, панядзелак, *5.30 — 24.00*
13, аўторак, *0.00 — 2.00*
15, чацвер, *0.00 — 6.30*
16, пятніца, *9.00 — 24.00*
17, субота, *0.00 — 9.00*
19, панядзелак, *8.00 — 11.00*
20, аўторак, *23.00 — 24.00*
21, серада, *0.00 — 13.30*
23, пятніца, *7.30 — 17.00*
25, нядзеля, *17.00 — 22.30*
27, аўторак, *11.30 — 24.00*
28, серада, *0.00 — 6.00*
29, чацвер, *12.30 — 24.00*
30, пятніца, *0.00 — 15.30*

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

П А К А Ш Т У Й Ц Е !

Салата з кальмараў

Спатрэбіцца: *1 тушка кальмара, бялок ад 2 яйкаў, 1 долька часнаку, зяленіва на смак, лёгкі маянэз.*

Тушку кальмара адварыць у кіпячай падсоленай вадзе на працягу 3 хвілін. Астудзіць, парэзаць саломкай. Бялок таксама парэзаць тонкімі палосачкамі. Змяшаць, дадаць здробнены часнок. У салату парваць трохі зяленіва, заправіць маянэзам.

Локшына з грыбным соусам

Спатрэбіцца: *500 г локшыны, жменя сушаных грыбоў, 2 цыбуліны, 1 ст. л. таматнай пасты, 1 ст. л. мукі.*

Адварыць локшыну. Асобна прыгатаваць грыбны соус. Для гэтага адварыць сушаныя грыбы, абсмажыць у алеі здробненую цыбулю, таматную пасту. У шклянцы грыбнога булёну развесці 1 ст. лыжку мукі, заліць цыбулю, дадаць дробна нарэзаныя адвараныя грыбы і даць пракіпець на слабым агні да загусцення, увесь час памешваючы. Гатовым соусам заліць локшыну, добра перамяшаць і прагрэць.

Хатняя грудзінка

Спатрэбіцца: *свіная грудзінка (на першы раз можна і невялікі кавалак); соль; спецыі: каляндра, кмен, чорны перац, лаўровы ліст, сушаны кроп, часнок; шалупінне цыбулі (замест хімічных фарбавальнікаў, надасць прыемнае адценне мясу).*

Кладзем грудзінку ў каструлю і заліваем марынадам. Для марынаду ў ваду насыпаем соль (на свой смак) і выбраныя спецыі. Марынаду павінна быць на 2-3 см вышэй мяса. Туды ж адпраўляем шалупінне (аптымальна — з 6-8 цыбулін). Ставім каструлю на агонь і даводзім да кіпення. Варым хвілін 15-20, у залежнасці ад памеру кавалка. Выключаем агонь і адпраўляем каструлю ў халоднае месца астываць. Калі мяса цалкам астыла, яго трэба яшчэ трохі заправіць. Здрабняем часнок, чорны перац, каляндру і націраем грудзінку сумессю. Есці яе можна амаль адразу. Але куды лепш будзе, калі даць ёй «адпачыць» у халадзільніку дзень-два, папярэдне загарнуўшы ў паперу, марлю або фольгу.

П А Р А Д А К У Д О М Е

Дыван як новы!

За гады эксплуатацыі дывановае пакрыццё страціла свой першапачатковы выгляд? З'явіліся сляды ад мэблі ці плямы? Вы лёгка справіцеся з гэтым!

Сляды ад ножак мэблі. Пакладзіце на гэтыя месцы чыстую вільготную тканіну, спачатку прайдзіцеся па ёй гарачым прасам, не высушваючы яе да канца, а затым — пару разоў шчоткай. Яшчэ адзін спосаб — добра адпарыць сляды ад мэблі, выкарыстоўваючы прас з магутным паравым ударам. І не забывайце перыядычна перасоўваць мэблю.

Выцертыя ці пашкоджаныя месцы. З ваўнянай тканіны ці ніткі, якая адпавядае колеру і малюнку дывана, нажніцамі нарэжце дробны ворс. На пашкоджанае месца нанясіце пэндзлікам тонкі пласт клею, раўнамерна засыпце ворсам і злёгку прагладзьце праз паперу цёплым прасам. Праз некалькі гадзін мяккай шчоткай выдаліце лішкі «ворсу».

Бляклы колер. Каб асвяжыць колер дывана, прамыйце яго водным растворам нашатырнага спірту ў суадносінах 2 ч. лыжкі на 1 л вады. Вярнае яркасць фарбаў і салёная вада з дадаваннем лімоннай кіслаты. Намачыце губку ў растворы, добра адцісніце і пратрыце дыван.

Камячкі акуратна зрэжце нажніцамі, бо яны заблытваюць валокны і пашкоджваюць тэкстуру дывана.

Падсмаленыя месцы. Ачысціце цвёрдай шчоткай, нанясіце мыйны сродак і пратрыце чыстай губкай. Праз 5 хвілін апрацуйце растворам борнай кіслаты (2 ст. лыжкі на шклянку вады), прамыйце халоднай вадой і дайце высахнуць. Калі пляму добра відаць, зрэжце некалькі валокнаў, змяшайце з клеем і прыклейце на пашкоджанае месца.

С А Л О Н П Р Ы Г А Ж О С Ц І

Касметыка ад бярозы

✓ Пажыўная маска для сухой скуры: 1 ст. л. смятаны змяшайце з 2 ст. л. бярозавіка, дадайце 1 ч. л. мёду. Старанна перамяшайце і нанясіце сумесь на скуру на 10—15 хвілін. Спаласніце прахалоднай вадой. Скура пасля такой маскі набудзе прыгожае матавае адценне.

✓ Пры выпадзенні валасоў: 1 ст. л. лісця бярозы заліваем шклянкай вару, кіпяцім 15-20 хвілін, працэджваем, дадаем гатаванай вады да першапачатковага аб'ёму. Гэтым адварам спалоскваем галаву пасля мыцця.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	5.30	20.44	15.14
Віцебск	5.15	20.39	15.24
Магілёў	5.20	20.34	15.14
Гомель	5.22	20.25	15.03
Гродна	5.46	20.59	15.13
Брэст	5.52	20.54	15.02

Месяц

Маладзік 29 красавіка.
Месяц у сузор'і Рака.

Імяніны

Пр. *Аляксандра, Гаўрылы, Рыгора, Фёдара.*
К. *Антаніны, Марыі, Ніны, Аляксандра, Пятра, Святаслава.*

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

ЗАЎТРА



…у суседзяў

ВАРШАВА +12..+14°С	КІЕЎ +19..+21°С	РЫГА +5..+7°С
ВІЛЬНЮС +11..+13°С	МАСКВА +10..+12°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ +5..+7°С

УСМІХНЕМСЯ

Люся Сідарава была вельмі адукаванай жанчынай і, паднімаючы з падлогі п'янага мужа, кожны раз праклінала Ньютана і Мендзялеева.

Адэскі панадворак:
— Сёмачка, ідзі есці!
— Я паеў у Паўліка!
— Вой! Гэта не сын, а золата!

Акцыя ў фітнес-клубе: «Калі вы купіце ў нас сямейную карту для сябе, жонкі і дзіцяці, то ваша палюбоўніца зможа наведваць наш клуб бясплатна!»

— Ты што піць будзеш: піва, віно, гарэлку, каньяк?
— Так, мабыць, у такой паслядоўнасці і буду піць.

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.716. Індэкс 63850. Зак. № 1696.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 2 мая 2014 года.